

МІСІЯ ДАБРЫНІ Ў СІРЫІ

4

ЧЫМ ЗДЗІЎЛЯЮЦЬ СЕЛЬСКІЯ КЛУБЫ

10




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 САКАВІКА 2023 г.
СЕРАДА
№ 59 (29939)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім РЫЖАНКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*«Па прапанове моладзі мы вырашылі стварыць Усебеларускую лігу дэбатаў. Будзем падказваць маладым людзям зразумелыя пытанні: як развіваецца наша краіна, што адбываецца ў свеце. Падключым да гэтага працэсу вядучыя ВНУ нашай краіны. Асноўнай пляцоўкай хочам зрабіць Акадэмію кіравання, таму што тут ёсць метадычнае суправаджэнне. Вельмі важна, што гэта ініцыятыва саміх юнакоў і дзяўчат. Яны хочуць надаць сабе арганізаваны характар, каб на працягу года гэтая ініцыятыва знаходзіла розныя магчымасці для правядзення такіх дэбатаў як на рэгіянальным узроўні, так і на рэспубліканскім».*

# Цэлы мех бярозавіку



Фота БелТА.

Лясгасы Гродзенскай вобласці пачалі нарыхтоўваць бярозавы сок. Каб забяспечыць гаючым напоем усіх ахвотных, збор вядуць у Лунненскім, Скідзельскім, Азёрскім, Берштаўскім, Навагрудскім і Парэцкім лясніцтвах.
На здымку: нарыхтоўшчык соку Аляксандр ТРОЦКІ і ляснік Лунненскага лясніцтва Аляксандр МЕЛЕХ.

## КОРАТКА

- **Віцебскія энергетыкі распрацавалі новую сістэму інтэлектуальнага кіравання вулічным асвятленнем.**
- Скрынінг першасных імунадэфіцытаў у нованароджаных запускаюць у Мінску з 1 красавіка.
- **Беларусь уводзіць ліцэнзаванне вывазу збожжавых.**
- Першыя пастаўкі ў Беларусь зімбабвійскай бавоўны чакаюцца ў чэрвені-ліпені 2023 года.
- **Новы цягнік у зносінах Мінск — Архангельск пачне курсіраваць з 22 красавіка 2023 года.**

Па палічках

## УСЁ ПРА БІЯМЕТРЫЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

### Лічбавыя зносіны з дзяржавай праз ID-карткі

**Крыху больш чым 2 % беларусаў ужо маюць біяметрычныя дакументы, прычым атрымліваць іх грамадзяне краіны могуць па жаданні, а іншаземцы — абавязкова. За паўтара года (ад пачатку выдачы новых дакументаў з 1 верасня 2021-га) жыхары краіны атрымалі 165 тысяч ID-картак, а іншаземныя грамадзяне і асобы без грамадзянства — больш як 58 тысяч біяметрычных пасведчанняў на жыхарства. Звыш 135 тысяч чалавек атрымала біяметрычныя пашпарты для выезду за мяжу. Навошта патрэбныя пін-коды да ідэнтыфікацыйнай карткі, куды ідуць адбіткі пальцаў, як аднавіць страчаны дакумент? На гэтыя і іншыя пытанні адказалі спецыялісты.**

### ЯК АТРЫМАЦЬ ID-КАРТКУ?

Біяметрычныя дакументы ў Беларусі вырабляюцца адпаведна з патрабаваннямі Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (ICAO), яны характарызуюцца высокай ступенню абароны.

СТАР. 3

Ноу-хау

## ТЭХНАЛАГІЧНЫ СУВЕРЭНІТЭТ КРАІНЫ ПРАЗ МАДЭРНІЗАЦЫЮ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

**Агульнавядома, што мадэрнізацыя і рэканструкцыя прамысловых прадпрыемстваў забяспечвае эканамічную бяспеку і незалежнасць краіны. Эксперты распавялі аб інавацыйных тэхналогіях прамысловай галіны, аб тэхналогіях стварэння экспартна арыентаванай тэхнікі і, у выніку, аб падтрымцы прадпрыемстваў у рэалізацыі інавацыйных праектаў бізнесу ў высокатэхналагічнай сферы.**

### Стаўка на робатаў

«Пасля распаду СССР у нас застаўся вельмі магутны прамысловы комплекс. Наша заслуга ў тым, што мы яго захавалі і ён паспяхова развіваецца ўжо амаль 30 гадоў. Сучасныя тэндэнцыі развіцця машынабудавання — электрыфікацыя і інтэлектуалізацыя транспарту. Гэта і лічбавыя «двайнікі», і лічбавыя тэхналогіі. Наш інстытут у гэтым актыўна ўдзельнічае, мы працуем з усімі буйнымі прамысловымі прадпрыемствамі галіны. Сярод нашых кліентаў — БЕЛАЗ, МТЗ, МАЗ, «Белкамунмаш», — адзначыў **генеральны дырэктар Аб'яднанага інстытута машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей ПАДДУБКА.** — Дзякуючы супрацоўніцтву з вядучымі ВНУ краіны мы атрымліваем падрыхтаваных спецыялістаў, далучаем іх да працэсу развіцця сучасных тэхналогій і паспяхова працуем з прадпрыемствамі над самымі складанымі задачамі».

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X
23059>

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!
Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!
Ідзе падпіска на II квартал 2023 года
ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# ПРЭЗІДЭНТ ЗВЕРНЕЦЦА З ПАСЛАННЕМ ДА НАРОДА І ПАРЛАМЕНТА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 31 сакавіка звернецца са штогадовым Пасланнем да беларускага народа і парламента, паведаміў журналістам кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА.**

«Я хацеў бы адзначыць, што пытанні развіцця дзяржавы і грамадства знаходзяцца ў пастаянным полі зроку кіраўніка дзяржавы. Паглядзіце, які насычаны графік у Прэзідэнта. Літаральна нядаўна прайшоў шэраг мерапрыемстваў з удзелам Прэзідэнта. Гэта пасяджэнне Савета Міністраў, пасяджэнне Савета бяспекі, нарада з сілавым блокам краіны, наведванне прамысловых прадпрыемстваў, паездкі ў замежжа, дзе адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі і прадстаўнікамі дружалюбных нам краін. У ходзе гэтых мерапрыемстваў, вядома ж, вырашаліся сур'ёзныя дзяржаўныя задачы, па розных напрамках: і бягучай дзейнасці, і на перспектыву. Літаральна ўчора пры назначэнні кіруючых кадраў мясцовых выканаўчых органаў улады Прэзідэнт абазначыў цэлы спектр і праблем, і адначасова задач, якія датычацца не толькі тых кіраўнікоў, якія былі назначаны, але і ўсіх дзеючых сёння кіраўнікоў вертыкалі ўлады», — расказаў Ігар Сергеенка.

Прэзідэнт адзначыў, што год будзе асаблівым. «Асаблівым ён будзе ў тым ліку ў плане падрыхтоўкі да найважнейшых палітычных падзей — электаральнай кампаніі. У 2024 годзе ў нас пройдуць адначасова выбары ў парламент і мясцовыя Саветы дэпутатаў. І ўпершыню фактычна ў новым фармаце — выбары дэлегатаў Усебеларускага народнага сходу. Усе гэтыя працэсы будуць праходзіць практычна адначасова. Гэта вялікі, вядома ж, аб'ём арганізацыйнай работы, падрыхтоўчай. Гэта даволі сур'ёзныя і маштабныя мерапрыемствы. Але наперадзе нас чакае яшчэ адно знакавае, фундаментальнае мерапрыемства — гэта штогадовае Пасланне Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту. Яно адбудзецца літаральна на гэтым тыдні — 31 сакавіка, у пятніцу, — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Я хацеў бы яшчэ раз падкрэсліць, што дадзенае мерапрыемства знакавае, фундаментальнае, дзе Прэзідэнт у сваім выступленні вызначае найбліжэйшую стратэгію развіцця нашай краіны ва ўмовах геапалітычнай абстаноўкі, якая дынамічна мяняецца. Але гэта ж у першую чаргу і адказ на тыя пытанні, якія хвалююць нашых грамадзян. Гэта аналіз той абстаноўкі, якая складваецца тут і цяпер, а таксама на перспектыву. Для якаснай падрыхтоўкі пакета дакументаў па даручэнні Прэзідэнта Адміністрацыяй былі задзейнічаны розныя дзяржаўныя, грамадскія структуры, навуковая супольнасць. Арганізавана вывучэнне тэндэнцый развіцця абстаноўкі ў рэгіёнах і грамадскай думкі. Гэтыя матэрыялы даюць магчымасць кіраўніку дзяржавы дадаткова прааналізаваць тую сітуацыю, якая складваецца ў краіне, і вызначыць комплексна тое Пасланне, тыя думкі, якія будзе Прэзідэнт закладваць у тэкст. Хацеў бы адзначыць, што Прэзідэнт працягвае работу над Пасланнем. Сітуацыя дынамічна мяняецца, практычна штодзённа, і гэты дакумент патрабуе актуалізацыі».

Плануецца, што мерапрыемства пройдзе ў традыцыйным для апошніх гадоў фармаце — ва ўрачыстай абстаноўцы ў Палацы Рэспублікі. «У ім прымуць удзел дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, члены Савета Рэспублікі, кіраўнікі міністэрстваў, дзяржаўных камітэтаў, мясцовых органаў улады, прадстаўнікі працоўных калектываў, прамысловых прадпрыемстваў, сельскай гаспадаркі, навукі, адукацыі, аховы здароўя, сродкаў масавай інфармацыі, дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў Мінску, дэлегацыі ўсіх рэгіёнаў і горада Мінска. Плануецца, што ў мерапрыемстве прымуць удзел больш за 2,5 тыс. чалавек», — падкрэсліў Ігар Сергеенка.

«Мы разумеем, што Пасланне — гэта перш за ўсё зварот да беларускага народа, але, зразумела, аўдыторыя будзе значна шырэйшая. Гэта яшчэ адна магчымасць для кіраўніка дзяржавы данесці дзяржаўную пазіцыю нашай краіны да народаў тых краін, камунікацыі з якімі з-за пэўных акалічнасцяў і абвастрэння міжнароднай абстаноўкі, пэўнага геапалітычнага процістаяння крыху страчаны. Упэўнены, што выступленне кіраўніка дзяржавы будзе яркім, цікавым, вострым і актуальным», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

**БелТА.**

З першых вуснаў

# «МЫ ЗРОБІМ МАКСІМАЛЬНА ЎСЁ МАГЧЫМАЕ, КАБ АКАЗАЦЬ ДАПАМОГУ І ПАДТРЫМКУ НАШЫМ СЯБРАМ З ЗІМБАБВЭ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з міністрам замежных спраў і міжнароднага гандлю Зімбабвэ Фрэдэрыкам Шава. Як пажартаваў Аляксандр Лукашэнка, сустракаючы гасцей, напрыканцы сакавіка надвор'е паказала афрыканскім гасцям, што такое зіма ў Беларусі.**

«Вельмі добра, што мы вытрымліваем нашы дамоўленасці і вы сёння знаходзіцеся ў Беларусі з дзелавым візітам. Я яшчэ раз хачу пацвердзіць гатоўнасць Беларусі да цеснага супрацоўніцтва. Мы намецілі спецыяльны план работы з Зімбабвэ і строга гатовы прытрымлівацца гэтых планаў і заданняў. У той жа час намеціліся некаторыя новыя напрамкі супрацоўніцтва, перш за ўсё ў гуманітарнай сферы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён нагадаў, што са сваім калегам з Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагва дамовіўся ўдзяліць вялікую ўвагу супрацоўніцтву ў сферы мацярынства, дзяцінства, аховы здароўя, дзіцячага харчавання. Кіраўнік дзяржавы выказаў спадзяванне, што хутка ў Беларусь прыедзе жонка прэзідэнта, якая ў Зімбабвэ займаецца гэтым пытаннем. «Вы павінны ведаць, што мы зробім максімальна ўсё магчымае, каб аказаць тут дапамогу і падтрымку нашым сябрам з Зімбабвэ. На нас вы можаце разлічваць у гэтым плане», — паабяцаў Аляксандр Лукашэнка.

Што датычыцца гандлёва-эканамічных адносін, то, па словах беларускага лідара, шляхі вядомыя: «Мы гатовы з вамі не проста абменьвацца таварамі — мы гатовы ствараць сумесныя прадпрыемствы ў вас. Мы гатовы прыняць вашы інвестыцыі ў Беларусі, калі гэта будзе вас цікавіць. І на цалкам высокай цывілізаванай аснове выбудоўваць супрацоўніцтва ў сферы эканомікі. Усе дамоўленасці, якіх мы дасягнулі падчас майго візіту ў вашу краіну, будуць няўхільна выконвацца». Прэзідэнт падкрэсліў, што на міждзяржаўным узроўні створана камісія. Развіццё ўзаемаадносін паміж Беларуссю і Зімбабвэ кантралюе віцэ-прэм'ер Пётр Пархомчык. Прэзідэнт адзначыў, што яго спецыяльны пасланнік Віктар Шэйман часта наведвае Зімбабвэ. «Калі тэрмінова нейкія пытанні ўзнікнуць, я праз яго буду інфармаваць і вас, і майго калегу — прэзідэнта Зімбабвэ. Таму вы можаце разлічваць на нашы самыя добрыя і рашучыя адносіны з вашай краінай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт нагадаў, што намячаўся шэраг праграм па супрацоўніцтве на шматбаковай аснове з удзелам Беларусі, Зімбабвэ і іншых дзяржаў. «Калі ў вас будзе да гэтага цікавасць і ў гэтых краін, мы зробім усё неабходнае для таго, каб супрацоўнічаць з вамі», — пацвердзіў кіраўнік дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што даволі падрабязна абмяркоўваў з Прэзідэнтам Расіі сумеснае супрацоўніцтва з афрыканскімі дзяржавамі, перш за ўсё з Зімбабвэ, і атрымаў ад яго запэўніванні ў вялікай зацікаўленасці да выбудоўвання такога эфектыўнага ўзаемадзеяння.

«Словам, усё, што я абяцаў прэзідэнту, я зрабіў і працягваю рабіць, і можаце на нас разлічваць», — падсумаваў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу Фрэдэрык Шава падзякаваў беларускаму лідару за запрашэнне і сустрэчу. «Дазвольце мне перадаць самыя цёплыя пажаданні ад вашага брата — прэзідэнта Зімбабвэ. Ён перадае вам пажаданні моцнага здароўя і далейшага развіцця паміж нашымі краінамі», — сказаў ён. Міністр падзякаваў ураду Беларусі і свайму беларускаму калегу за арганізацыю візіту, гасціннасць, праяўленую да членаў дэлегацыі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### ❍ У тэму

## Пасол Зімбабвэ ў Беларусі будзе прызначаны ў найбліжэйшы час

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі Фрэдэрык Шава сустрэўся з беларускімі журналістамі. Ён адзначыў, што паміж Зімбабвэ і Беларуссю склаліся выдатныя адносіны, дзякуючы чаму бакі развіваюць супрацоўніцтва ў розных сферах і вывучаюць новыя магчымасці для ўзаемадзеяння. «Вельмі інтэнсіўна развіваецца супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі. І Беларусь вельмі садзейнічае забеспячэнню харчовай бяспекі Зімбабвэ, пастаўляючы трактары і іншую сельскагаспадарчую тэхніку. Мы ў поўнай меры выкарыстоўваем гэту магчымасць. Спадзяёмся, што дзякуючы такім візітам, як гэты, мы зможам палепшыць, нарасціць нашу актыўнасць у сферы сельскай гаспадаркі», — сказаў міністр.

Фрэдэрык Шава расказаў, што правёў плённыя перагаворы з міністрам замежных спраў Беларусі. Для дэлегацыі Зімбабвэ былі арганізаваны сустрэчы з іх беларускімі калегамі, якія працуюць у сферах сельскай гаспадаркі, грамадзянскай абароны, гандлю, прамысловай вытворчасці. Галоўнай падзеяй візіту стала адкрыццё ў Мінску Пасольства Зімбабвэ. «У Зімбабвэ ўжо ёсць Пасольства Беларусі. На прынцыпах узаемнасці Зімбабвэ днямі таксама адкрыла сваё пасольства ў Мінску. Мы зараз вызначыліся з работамі па ўладкаванні памяшканняў, дзе размяшчаецца пасольства. І гэты працэс будзе завершаны настолькі хутка, наколькі магчыма. Толькі пасля гэтага наш пасол будзе прызначаны. Гэта адбудзецца не ў аддаленай будучыні, а на працягу некалькіх наступных месяцаў», — сказаў Фрэдэрык Шава.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Парламент Японіі ўхваліў бюджэт з рэкорднымі ваеннымі расходамі



Бюджэтная камісія верхняй палаты парламента Японіі ўхваліла праект дэфіцытнага бюджэту на наступны фінансавы год (пачнецца ў красавіку 2023 года) з рэкорднымі расходамі ў 114,38 трыльёна іен (каля $870 млрд) на фоне росту ваенных выдаткаў у рамках плана ўрада па кардынальным умацаванні абароннага патэнцыялу на працягу пяці гадоў. Аб гэтым паведаміла агенцтва Kyodo. Галоўнай прычынай росту аб'ёмаў бюджэту стане запланаванае павелічэнне выдаткаў на абарону. Яны складуць 6,8 трлн іен (каля $51,8 млрд), што ў 1,25 раза больш за паказчык бягучага года. 211,3 млрд іен (каля $1,6 млрд) з іх будуць выдзелены на закупку ў ЗША крылатых ракет Tomahawk. Абаронныя выдаткі, як чакаецца, перавысяць адзнаку ў 1 працэнт ВУП, якая дзесяцігоддзямі лічылася лімітам для дадзенага артыкула бюджэту. 16 снежня мінулага года ўрад зацвердзіў абноўленую стратэгію нацыянальнай бяспекі, якая прадугледжвае павелічэнне абаронных расходаў да 2027-га да 2 працэнтаў ВУП на ўзор НАТА. Прэм'ер-міністр Фуміа Кісіда распарадзіўся забяспечыць фінансаванне бюджэту на абаронныя патрэбы да таго часу на ўзроўні 8,9 трлн іен ($67,8 млрд).

## У ЗША з пачатку года ў інцыдэнтах са стральбой загінула каля 10 тысяч чалавек




У Злучаных Штатах сёлета ад ужывання агнястрэльнай зброі загінула каля 10 тысяч чалавек, у тым ліку больш за 400 дзяцей. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на даследчую арганізацыю Gun Violence Archive. Паводле яе звестак, за першыя тры месяцы бягучага года быў зарэгістраваны 131 выпадак масавай стральбы. Днямі адбылася трагедыя ў прыватнай хрысціянскай школе ў амерыканскім горадзе Нэшвіл (штат Тэнесі): трое дзяцей і трое дарослых былі забітыя падчас перастрэлкі ў навучальнай установе. Паводле звестак паліцэйскага дэпартамента Нэшвіла, стральбу ў школе ўчыніла 28-гадовая жанчына. Gun Violence Archive адзначае, што інцыдэнты са стральбой у ЗША летась забралі жыцці больш за 43,6 тысячы чалавек. Больш за 37,9 тысячы чалавек летась атрымала раненні рознай ступені цяжкасці, у тым ліку 4,4 тысячы дзяцей. Больш як 1,6 тысячы дзяцей загінула.

## Індыя пачне адпраўляць турыстаў у космас да 2030 года



Індыйская арганізацыя касмічных даследаванняў (Indian Space Research Organisation, ISRO) плануе да 2030-га наладзіць адпраўку турыстаў у космас і ўжо працуе над прызначаным для такіх мэт модулем. Пра гэта распавёў кіраўнік індыйскага касмічнага ведамства Шрыдхара Панікер Самнатх, перадае ТАСС. «Вядуцца работы над уласным індыйскім модулем для касмічнага турызму, які будзе бяспечным і шматразовым», — заявіў Самнатх. Паведамляецца, што кошт палёту складзе, як мяркуецца, прыкладна 60 мільёнаў рупій (каля 700 тыс. долараў). «Людзі, якія адправяцца ў гэтае падарожжа, таксама змогуць называць сябе астранаўтамі», — падкрэсліў кіраўнік ISRO. У хуткім часе ведамства плануе арганізаваць першы палёт пілатуемага касмічнага карабля Gaganyaan («Нябесны карабель»), яго першы запуск намечаны на 2024 год. Дакладная дата залежыць ад вынікаў іспытаў сёлета ў маі.

# ТЭХНАЛАГІЧНЫ СУВЕРЭНІТЭТ КРАІНЫ ПРАЗ МАДЭРНІЗАЦЫЮ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Таксама важна развіваць такі кірунак, як рабатызацыя. «Зараз сучасныя тэхналогіі абсталёўваюцца велізарным робататэхнічным комплексам. Напрыклад, не так даўно мы былі на адным з заводаў Кітая, дзе нам паказалі цэх па зборцы аўтамабіляў. Яго назвалі «цёмны цэх», бо там не трэба ўключаць святло, робаты цалкам замясцілі чалавека і выконваюць усе аперацыі: робяць аўтамабільныя кузавы, зварку, афарбоўку. Атрымліваецца кругласутачная работа цэхаў», — распавёў Сяргей Паддубка. Таксама ён падкрэсліў, што рабатызацыя немагчымая без развіцця лічбавізацыі.

Гаворачы пра ўплыў санкцый, кіраўнік інстытута адзначыў: «У свой час мы разлічвалі на кантакты з развітымі краінамі ў частцы лічбавай электронікі. Цяпер з'явіліся пэўныя складанасці, але дзякуючы тым зачынам, якія ў нас ёсць, мы працуем з нашымі дружалюбнымі краінамі. Асабліва з Кітаем. Мы наладжваем адносіны з вядучымі пастаўшчыкамі і вытворцамі аўтамабільнай тэхнікі. Гэтыя кантакты пашыраюцца і развіваюцца. Думаю, мы будзем і далей паспяхова развівацца. Там, дзе мы страцілі нейкія сувязі, аднавім іх з новымі партнёрамі», — канстатаваў ён.

Сярод прарыўных тэхналогій Сяргей Паддубка вылучыў аўтаматызацыю і рабатызацыю. Сучасныя прамысловыя тэхналогіі немагчымыя без робататэхнічных комплексаў. А рабатызацыя немагчымая без лічбавізацыі. У 2021 годзе прынята Комплексная дзяржаўная праграма развіцця электратранспарту на 2021—2025 гады. А Аб'яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук краіны — галаўное прадпрыемства, каардынатар працэсу па стварэнні новых кампетэнцый у галіне электрапрывада, кампанентнай базы электратранспарту.




## Два вектары

У сваю чаргу, **дэкан машынабудаўнічага факультэта БНТУ Андрэй САФОНАЎ** падкрэсліў значнасць сістэмы адукацыі ў забеспячэнні тэхналагічнага суверэнітэту краіны. «Відавочна, што без якаснай падрыхтоўкі кадраў немагчыма далейшае развіццё», — паведаміў ён. Андрэй Сафонаў назваў два вектары, па якіх неабходна развіваць прамысловасць. «Першы вектар — цесная сувязь прамысловасці, адукацыі і навукі. Гэта павінна пераходзіць у практычную плоскасць і штодня рэалізоўвацца. Другі — больш вузкае аб'яднанне намаганняў і патэнцыялаў Расіі і Беларусі. Зараз расійскі бок асаблівую ўвагу ўдзяляе навуковаму, вытворчаму і адукацыйнаму патэнцыялу нашай краіны. Напрыклад, з БНТУ падпісаны дагаворы і рэалізоўваюцца праграмы па стварэнні і развіцці перадавой інжынернай школы Саюзнай дзяржавы», — расказаў ён. Напрыклад, добра сябе зарэкамендаваў тандэм Пскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта і БНТУ па стварэнні перадавой інжынернай школы ў галіне станкабудавання».

«Мы вялікую ўвагу ўдзяляем развіццю лічбавізацыі ў адукацыі. З дапамогай лічбавых, камп'ютарных тэхналогій з большай эфектыўнасцю сістэматызуем падрыхтоўку спецыялістаў», — дадаў дэкан. На думку Андрэя Сафонава, без уласных асноўных сродкаў вытворчасці нельга марыць аб развіцці аўтамабілебудавання і іншых галін прамысловасці. Сёння асобныя прадпрыемствы, якія своечасова набылі замежныя станкі, пасля сутыкнуліся з праблемамі, трапіўшы ў пэўную тэхналагічную, тэхнічную залежнасць, але... Родная Айчына не без уласных «кулібіных». Цяпер практычна палова сапраўды актыўных інжынераў з машынабудаўнічай падрыхтоўкай займаецца стварэннем уласнай базы праграмнага забеспячэння замежных станкоў.

Таму неабходна сыходзіць ад такой практыкі, ствараючы свае станкі, якія вельмі патрэбныя краіне. «Асаблівую ўвагу неабходна аддаваць развіццю лічбавізацыі ў адукацыі. Індустрыя 4.0 — гэта рэальнасць, у якой павінны расці нашы студэнты і маладыя спецыялісты. У БНТУ, непасрэдна на машынабудаўнічым факультэце, мы перайшлі ў плоскасць рэалізацыі гэтых задач», — лічыць дэкан.

## Без імпарту цяжка, але можна

Гаворачы аб імпартазамяшчэнні, **загадчык лабараторыі Аб'яднанага інстытута машынабудавання НАН Беларусі, прафесар кафедры «Тэхналогія машынабудавання» БНТУ Марат БЕЛАЦАРКОЎСКІ** адзначыў: «Адна з задач, якая перад намі стаіць, — рознымі метадамі аднавіць дэталі, якія на стыковачных вузлах, аўтамабілях, сельскагаспадарчай тэхніцы зроблены за мяжой. Гэта не так проста, як здаецца на першы погляд. Але мы гэтым займаемся, і даволі паспяхова, — акцэнтаваў увагу ён.

«Таксама толькі мы на постсавецкай прасторы займаемся такой прарыўной тэхналогіяй, як нанясенне адносна тоўстых металічных пакрыццяў на палімерныя вырабы. Гэта трэба для касмічнай сферы, беспілотнага транспарту. Гэта вельмі запатрабаваны кірунак. Як толькі мы правялі эксперыменты і зрабілі першыя ўзоры, адразу ж з намі заключыла дагаворы карэйская кампанія LG Electronics, і мы з ёй два гады супрацоўнічалі, — сказаў прафесар. — Акрамя таго, у нас з'явіцца сур'ёзныя партнёры ў асобе кітайскіх спецыялістаў. Ім вельмі падабаюцца нашы нестандартныя рашэнні».

У цэлым, паводле яго слоў, у інстытута распрацавана даволі вялікая колькасць разнастайных тэхналогій, але да прамысловага ўкаранення іх не так проста давесці. «У нас ёсць вельмі добрая школа, і мы імкнёмся яе захаваць. Самае галоўнае — выхаваць маладое пакаленне, якое б і далей працягнула развіваць нашу навуку», — падкрэсліў Марат Белацаркоўскі.

## Лічбавыя тэхналогіі

**Загадчык лабараторыі прамысловай робататэхнікі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта Валерый КАСЬЯНІК** распавёў аб трох асноўных тэхналогіях у сферы лічбавізацыі, якімі займаецца дадзеная лабараторыя. «Першая — тэхналогія калабарацыйных робатаў. Гэта досыць новая ідэя, рэалізаваная дацкімі студэнтамі ў 2010-х гадах. Такі робат можа і павінен працаваць з чалавекам. Гэта не дзве ўзаемавыключальныя сутнасці. І гэта правільна. Робат забірае на сябе руцінную работу, а чалавек займаецца інтэлектуальнай. Яны дапаўняюць адзін аднаго», — адзначыў ён.

Другая — тэхналогія лічбавых «двайнікоў», або лічбавага інжынірынгу. «Гэта выкарыстанне розных лічбавых інструментаў для павышэння эфектыўнасці праектавання. Значыць, скарачаецца час з'яўлення тэхнічнага рашэння, яго праверка адбываецца без фізічных прататыпаў, што моцна патанняе працэс распрацоўкі», — звярнуў увагу загадчык лабараторыі.

І трэцяя тэхналогія, якая цяпер перажывае вялікі ўздым, — штучны інтэлект. «Мы часткова займаемся гэтай тэхналогіяй. Яна вельмі карысная пры апрацоўцы даных», — дадаў Валерый Касьянік.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# УСЁ ПРА БІЯМЕТРЫЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гэта разнастайныя ахоўныя фарбы, вільгацеўстойлівая папера з ахоўнымі валокнамі, ахоўная прашывачная нітка, электронны чып і многае іншае, паведаміў **Павел ХРЫШЧАНОВІЧ, намеснік начальніка дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў:**

*— На інтэгральнай мікрасхеме ўтрымліваюцца біяметрычныя даныя грамадзяніна: фотавыява, адбіткі пальцаў, электронны лічбавы подпіс (ЭЛП). Усе інфармацыйныя рэсурсы МУС інтэграваны ў Агульнадзяржаўную аўтаматызаваную інфармацыйную сістэму (ААІС), з якой грамадзяне могуць атрымліваць звесткі, якіх няма на ID-картцы. Гэта рэгістрацыя па месцы жыхарства, даныя пра шлюб, пра дзяцей і пра валіднасць (сапраўднасць) карткі.*

Працэдура прыёму папер на атрыманне біяметрычных дакументаў максімальна спрошчана. Чалавеку дастаткова звярнуцца ў падраздзяленне дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі, прадставіць свой пашпарт і аплаціць дзяржпошліну. Супрацоўнік дэпартамента на месцы зробіць фота заяўніка, пры дапамозе графічнага планшэта атрымае ўзоры яго подпісу, здыме адбіткі ўказальных пальцаў. Пасля заяўнік атрымлівае сваю заяву, распісваецца ў ёй і правярае свае персанальныя даныя, а супрацоўнік дэпартамента з дапамогай свайго ЭЛП накіроўвае заяву спачатку ў цэнтр апрацоўкі даных, а потым — у цэнтр персаналізацыі.



*— Адбіткі здымаюцца па пэўнай матэматычнай формуле, запісваюцца на чып і ў інфармацыйны рэсурс МУС для наступнай зверкі паўторнасці. Прымяняецца ў нейкіх крыміналістычных уліках гэтыя адбіткі не могуць,* — удакладніў Павел Хрышчановіч. *— А цэнтр персаналізацыі ў Беларусі адзіны для краіны і знаходзіцца ў Мінску ў адрозненне ад папяровых пашпартоў, якія друкуюцца дэцэнтралізавана ў бюро пашпартызацыі ў кожным абласным цэнтры.*

## ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ЗГУБІЎ ПІН-КОД?

Гатовую ID-картку грамадзянін атрымлівае разам з канвертам, у якім знаходзяцца два пін-коды і адзін пак-код. Першы пін патрэбны, каб дазволіць доступ сістэме да персанальных даных чалавека, а другі — для пацвярджэння электроннага подпісу кліента дзяржпаслуг. Пак-код патрэбны, калі папярэдняя інфармацыя будзе ўведзена памылкова.

*— Калі вы згубілі свой пін-канверт і не памятаеце коды, вам прыйдзецца мяняць ID-картку за ўласны кошт, бо ў сістэме МУС гэтая інфармацыя захоўваецца толькі на працягу трох месяцаў пасля выдачы дакумента,* — звярнуў увагу спецыяліст.

Першую ID-картку грамадзянін атрымлівае толькі па адрасе рэгістрацыі, а ўсе наступныя — у любым месцы Беларусі.

## КОЛЬКІ КАШТУЮЦЬ БІЯМЕТРЫЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ?

Для непаўналетніх ID-картка бясплатная (хоць вялікага сэнсу ў яе атрыманні няма, лічаць спецыялісты, бо для пэўных дзяржпрацэдур дастаткова пасведчання аб нараджэнні дзіцяці). Пенсіянеры і інваліды I і II груп заплацяць за ID-картку адну базавую велічыню (цяпер — 37 рублёў). Астатнія — 1,5 базавай велічыні.

Біяметрычны пашпарт для непаўналетніх, пенсіянераў і інвалідаў I і II груп каштуе 1,5 базавай велічыні. Для ўсіх астатніх — дзве базавыя.

## ДЛЯ ЧАГО БЕЛАРУСУ ДВА ПАШПАРТЫ?

У пачатку біяметрычнага праекта людзі часта звярталіся ў МУС, указваючы важны момант. Калі яны падавалі пашпарт у пасольства для атрымання візы, яго на два-тры тыдні забіралі, і грамадзяне заставаліся ўвогуле без дакумента, які сведчыць асобу. Каб вырашыць праблему, беларусы могуць атрымліваць два ідэнтычныя біяметрычныя пашпарты, праўда, з рознымі нумарамі, абазначыў прадстаўнік Міністэрства ўнутраных спраў:

*— Такім чынам, можна адзін пашпарт здаць у пасольства, а па другім — выязджаць за мяжу. Сёння такой паслугай скарысталася больш як восем тысяч грамадзян.*

**Ірына СІДАРОК.**

Гонар краіны

# МЕДЫЦЫНСКІ СПЕЦНАЗ

## У Цэнтральным доме афіцэраў адбылася цырымонія ўшанавання ваеннаслужачых, якія выконвалі гуманітарную місію ў Сірыі

**На працягу 30 дзён спецыялісты медыцынскага атрада спецыяльнага прызначэння 432-га галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сіл аказвалі медыцынскую дапамогу сірыйскаму народу, які пацярпеў у выніку землетрасення. Як заўважыў на цырымоніі ўзнагароджання міністр абароны Віктар ХРЭНІН, усе гэтыя людзі — героі, сапраўдныя патрыёты нашай краіны, якія з гонарам выканалі задачу, пастаўленую кіраўніком дзяржавы.**

Як расказаў **начальнік медыцынскага атрада спецыяльнага прызначэння палкоўнік медыцынскай службы Андрэй ГУРЫНОВІЧ,** аб тым, што ім трэба ляцець у Сірыю, медыкі ў пагонах даведаліся за тры дні да вылету. У гэтую краіну, якая пацярпела ад землетрусу, выехалі 45 чалавек. Сярод іх — урачы-спецыялісты хірургічных і тэрапеўтычных спецыяльнасцяў, анестэзіёлагі-рэаніматолагі, а таксама медыцынскія сёстры, вадзіцелі і спецыялісты вузкіх спецыяльнасцяў: электрыкі, сувязісты, якія былі неабходны для поўнага самастойнага забеспячэння беларускай дэлегацыі.

За час знаходжання ў Сірыйскай Арабскай Рэспубліцы медыцынскія супрацоўнікі з Беларусі аказалі дапамогу больш як тром тысячам пацыентаў. Не адмаўлялі нікому, хто да іх звяртаўся. А звярталіся не толькі з траўмамі пасля землетрусу, а нават з хранічнымі захворваннямі.

Як прызнаўся Андрэй Гурыновіч, самая галоўная цяжкасць, з якой сутыкнуліся ў Сірыі беларусы, — моўны бар'ер. «Аднак дзякуючы сірыйскаму боку і нашаму перакладчыку, у нас усё атрымалася, — заўважыў ён. — Гэтая місія адрознівалася ад папярэдніх тым, што ў Сірыю выехаў медыцынскі атрад спецыяльнага прызначэння ў поўным складзе. У Ліване ў нас кожны год выязджалі асобныя прадстаўнікі медыцынскага



атрада, хірургічная брыгада — два ўрачы і дзве медыцынскія сястры. Тое, што больш за палову нашага медыцынскага персаналу прайшло праз місію Часовых сіл ААН у Ліване, нам вельмі спатрэбілася ў Сірыі. Ранейшыя зносіны з арабскім насельніцтвам вельмі дапамаглі. Мы паспелі пазнаёміцца з менталітэтам, культурай. Мы ехалі ў Сірыю ўжо дасведчанымі».

Нягледзячы на тое што за час знаходжання ў Сірыі беларускіх медыкаў фіксаваліся паўторныя штуршкі — землетрасенне было магнітудай 4,5 бала, — ніхто з медатрада не пацярпеў.

— У мяне сёння прыемная місія — ушаноўваць людзей самай гуманнай прафесіі, якія і ў мірны час выконваюць свае задачы, клапоцячыся і захоўваючы самае дарагое, што ёсць у нас — здароўе і жыццё, — звяртаючыся да ваеннаслужачых, якія прымалі ўдзел у гуманітарнай місіі ў Сірыі, адзначыў **міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН.** — Вельмі прыемна, што менавіта ваенныя людзі выконвалі місію, аказвалі дапамогу людзям, якія трапілі ў цяжкую сітуацыю ў Сірыйскай Арабскай Рэспубліцы. Вы на справе даказалі, што з'яўляецеся сапраўднымі патрыётамі нашай Радзімы, людзьмі, якія верныя воінскаму абавязку, нашай краіне і народу.

Як звярнуў увагу кіраўнік абароннага ведамства, у медыцынскага атрада, накіраванага ў Сірыю, была магчымасць на свае вочы пераканацца, у што можа ператварыцца краіна, якая трапляе пад уздзеянне агрэсіўнай, радыкальнай палітыкі Злучаных Штатаў. «Алепа (горад у Сірыі. — **«Зв.»**) некалі называўся горадам-казкай, — нагадаў Віктар Хрэнін. — Вы ўбачылі, у што ёнператварыўся ў выніку грамадзянскай вайны. Вось да чаго нас падштурхоўвалі ў 2020 годзе і працягваюць гэта рабіць цяпер. Нам ні ў якім разе нельга гэтага дапусціць!»

**Начальнік аперацыйнага аддзялення медыцынскага атрада спецыяльнага прызначэння капітан медыцынскай службы Аліна ЕМЯЛЬЯНЕНКА** падзялілася, што да камандзіроўкі ў Сірыю яна была ўжо падрыхтаванай. Толькі ў лютым вярнулася ў Беларусь пасля выканання місіі Часовых сіл ААН у Ліване. Літаральна праз некалькі дзён урач адправілася ў іншую арабскую рэспубліку. «Пацыенты звярталіся з рознымі паталогіямі, у тым ліку хірургічнымі, — расказала Аліна Емяльяненка. — Нямала было траўматалагічных пацыентаў, якія прыходзілі непасрэдна з траўмамі, атрыманымі ў выніку землятрусу. Вопыт, набыты ў Сірыйскай Арабскай Рэспубліцы, новы для мяне: мы ехалі аказваць дапамогу пацыентам, якія пацярпелі пасля землятрусу, — амаль баявы вопыт. Місія ў Ліване была іншая». Апошнім разам там Аліна знаходзілася каля пяці месяцаў, першая місія ў Ліван доўжылася для жанчыны амаль год.

Адзіным беларускім журналістам, які асвятляў гуманітарную місію нашых медыкаў у Сірыі, быў **намеснік начальніка 2-га карэспандэнцкага аддзела Ваеннага інфармацыйнага агенцтва «Ваяр» маёр Алег НЯКАЛА.** Менавіта дзякуючы яму мы даведваліся, як медыкі з Беларусі дапамагаюць сірыйскаму народу, які быў вельмі ўдзячны нам, у першую чаргу кіраўніку дзяржавы, за гэта. У той час як асноўныя сілы сусветнай супольнасці былі перакінуты на ліквідацыю наступстваў землятрусу ў Турцыі, менавіта Беларусь — адна з нямногіх краін, якая працягнула руку дапамогі і Сірыі.

Нягледзячы на тое, што за час сваёй службы ваеннаму карэспандэнту за межамі краіны ўдалося пабываць неаднойчы (падчас Міжнародных армейскіх гульняў, вучэнняў), гэтую камандзіроўку Алег Някала не забудзе ніколі. Ён добра разумеў, што будзе небяспечна: прычым не толькі з пункту гледжання таго, што нядаўна ў Сірыі адбыўся землятрус, а яшчэ і таму, што дагэтуль краіна знаходзіцца ў стадыі грамадзянскай вайны. «Самі сірыйцы былі настроены да нас вельмі добразычліва, — адзначыў Алег Някала. — Калі мы выходзілі ў горад, спрабавалі нас нечым пачаставаць: беларусаў яны ўспрымалі як сваіх ратавальнікаў».

Больш падрабязна пра гуманітарную місію медыцынскага атрада спецыяльнага прызначэння 432-га галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сіл у Сірыі — у публікацыі журналіста, які на працягу месяца знаходзіўся там у складзе беларускай дэлегацыі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

Унікальны досвед

# Місія ўзаемадапамогі і дабрыні

## Тысячы грамадзян Сірыі атрымалі высокакваліфікаваную медыцынскую дапамогу нашых спецыялістаў

**Беларускі ваенна-палявы шпіталь у Алепа завяршыў сваю гуманітарную місію. Наш кантынгент вярнуўся ў Беларусь. Сустракалі медыкаў у пагонах як герояў — з кветкамі, аркестрам, хлебам-соллю.**

Каля месяца таму медыцынскі атрад спецыяльнага прызначэння 432-га Галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь у экстранным парадку быў накіраваны ў сірыйскі Алепа для аказання медыцынскай дапамогі насельніцтву, якое пацярпела ад землетрасення. Нагадаем, 6 лютага на паўднёвым усходзе Турцыі і паблізу граніцы з Сірыяй адбыліся землетрасенні магнітудай 7,7 і 7,6 бала. Менавіта гэтыя дзве дзяржавы пацярпелі больш за ўсё. Сусветная арганізацыя аховы здароўя паведаміла, што ў Сірыі пасля землятрусу загінула каля васьмі тысяч чалавек. Дзясяткі тысяч жыхароў атрымалі траўмы і калецтвы.

Беларусы неабыякавыя да чужога гора. Як толькі стала вядома аб ахвярах землетрасення, у Мінску людзі масава пачалі прыходзіць да пасольстваў Турцыі і Сірыі, каб выказаць спачуванні ў сувязі з гібеллю людзей. Аднак дапамагчы мы гатовы не толькі словам, але і справай. Беларусь — адна з нямногіх, хто першай працягнула руку дапамогі шматпакутнаму народу Сірыйскай Арабскай Рэспублікі. Па рашэнні кіраўніка дзяржавы спецыялісты медыцынскага атрада спецыяльнага прызначэння былі накіраваны ў Алепа.

### Лячэбныя баі без пройгрышу

Сірыйскі народ заўсёды будзе памятаць тое, што для



іх зрабілі ўрачы з Беларусі. Дзень у дзень, без адзінага выхаднога, працавалі нашы спецыялісты. Дзякуючы рабоце беларускіх ваенных медыкаў, тысячы грамадзян Сірыі атрымалі высокакваліфікаваную медыцынскую дапамогу.

**Вядучы хірург 432-га Галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра палкоўнік медыцынскай службы Аляксей ТРУХАН,** які працаваў у Сірыі, адзначае, што па аналізе вынікаў аказанай дапамогі можна сказаць аб паспяховым выкананні задач, пастаўленых перад беларускімі ўрачамі. «Людзям было патрэбна наша садзейнічанне, — згадаў ён. — Мы, у сваю чаргу, набылі бясцэнны досвед аказання медыцынскай дапамогі вялікай колькасці пацярпелых, што значна павысіла ўзровень падрыхтоўкі ўрачоў. Гэта першы вопыт самастойнага выканання ваеннымі медыкамі падобных задач за межамі Беларусі на працягу доўгага часу. Прыйшлося ўлічваць многія асаблівасці рэгіёна: кліматычныя, моўныя, рэлігійныя, пытанні аховы».

Не было ніводнага дня, калі беларускім ваенным медыкам не давялося б уступаць у лячэбны бой. І ні разу ён не быў прайграны. Нашы спецыялісты аказвалі дапамогу ў сярэднім да 200 пацыентам у суткі. Прычым дапамагалі як пацярпелым ад землятрусу, так і тым, хто атрымаў траўмы і калецтвы ў выніку баявых дзеянняў.

— Хацелася дапамагчы як мага большай колькасці пацярпелых, — распавёў



**начальнік медыцынскага атрада спецыяльнага прызначэння 432-га Галоўнага ваеннага клінічнага медыцынскага цэнтра палкоўнік медыцынскай службы Андрэй ГУРЫНОВІЧ.** — Палявы лагер разгарнулі на працягу сутак. Праз суткі пасля прылёту мы ўжо ажыццяўлялі амбулаторны прыём. За ўвесь час знаходжання ў горадзе Алепа аказалі дапамогу 3082 пацыентам. Была вялікая колькасць пнеўманій, а таксама пераломаў ніжніх канечнасцяў ужо ў стадыі кансалідацыі. Жыхары Сірыі былі настроены ў адносінах да нас пазітыўна, чакалі дапамогі і з падзякай яе прымалі.

### Шукран, Беларусь!

Як адзначыў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны генерал-маёр Леанід КАСІНСКІ,** гуманітарная місія ў Сірыі па праве ўвойдзе ў гісторыю медыцыны Рэспублікі Беларусь як місія добрых сэрцаў.

«Задачы даводзілася выконваць не толькі ва ўмовах прыроднай катастрофы, але і ва ўмовах вядзення баявых дзеянняў, — звярнуў увагу Леанід Касінскі. — Мы з вамі ведаем, што супраць сірыйскага народа на працягу многіх гадоў вядзецца вайна. Акрамя таго, існаваў і моўны бар'ер. Умовы былі дастаткова няпростыя. Тым не менш, па паведамленнях з Сірыі, якія публікаваліся ў сродках масавай інфармацыі, мы бачылі, што нашы медыкі паспяхова спраўляліся з задачамі, якія былі пастаўлены перад імі. Па медыцынскую дапамогу звярталіся не толькі людзі, якія пацярпелі ад землетрасення. Ва ўмовах вядзення баявых дзеянняў у краіне вострa адчуваецца недахоп урачоў і лекаў. Таму да беларускіх медыкаў ішлі з дзеткамі, ішлі старыя, жанчыны — нашы медыкі не адмовілі ніводнаму чалавеку. Вопыт, які атрымалі нашы ваенныя медыкі, унікальны і дарагога варты».

Адпраўляючыся ў Сірыю, ніхто з медыкаў да канца не ўяўляў, у якім складаным становішчы давядзецца выконваць задачы, але ніхто з іх не адмовіўся. У выніку пастаўленыя задачы былі выкананы з гонарам. Дарэчы, беларускі ваенна-палявы шпіталь знаходзіўся побач з адной з мясцовых школ. Было прыемна чуць дзіцячы смех і радасныя крыкі: «Беларусі, беларусі!» Дырэктар гэтай школы Адэль Хусейн таксама звярталася па дапамогу да нашых медыкаў.

«Шукран, Беларусь! (Дзякуй, Беларусь!) — казала яна ваенным урачам. — Сірыйцы ведаюць, каму і за што дзякуюць. Мы ўдзячныя Беларусі за тую падтрымку, якую яна аказала Сірыі, за гуманітарнае садзейнічанне. Па сабе ведаю, што такое вайна, а цяпер яшчэ і землетрасенне. Таму ваша дапамога вельмі важная для нас. Беларускія медыкі ў літаральным сэнсе паставілі майго бацьку на ногі. Дзякуй вялікі беларусам: яны, нібы анёлы, прыляцелі і выратавалі нас».

Горад Алепа толькі пачаў аднаўляцца пасля страшнай вайны. Чатыры гады ён быў у аблозе і барацьбе з ісламістамі. Апошняе землетрасенні пагоршылі карціну. Аднак на дапамогу прыйшлі беларускія ваенныя ўрачы — каторы раз наша краіна прадэманстравала ўсяму свету, што беларусы не могуць заставацца ўбаку ад чужой бяды.

**Алег НЯКАЛА, фота аўтара.**

Баяздольнасць

# ЁСЦЬ ТАКАЯ АБАРОНА



**Ваенны камісарыят — орган мясцовага ваеннага кіравання, адказны за ваенна-мабілізацыйную і ўлікова-прызыўную работу ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь. У шэрагу задач, якія выконваюцца ваенкаматам, — забеспячэнне комплектавання войскаў тэрытарыяльнай абароны. У сённяшнім вельмі складаным міжнародным становішчы падрыхтоўка такіх фарміраванняў мае асаблівае значэнне. Аб тым, каго прызываюць у тэрытарыяльныя войскі, якія яны задачы выконваюць, як рыхтуюць асабовы склад, карэспандэнту «Звязды» расказаў ваенны камісар Першамайскага раёна сталіцы палкоўнік Яўген ЛІНГА.**

***— Яўген Іванавіч, што гэта за войскі — тэрытарыяльная абарона? Якія асноўныя задачы яны выконваюць?***

— Войскі тэрытарыяльнай абароны выконваюць разнастайныя задачы: ахову аб'ектаў крытычнай інфраструктуры, забеспячэнне мабілізацыі прыпіснога складу ў выпадку вайны, выкананне асобных баявых задач сумесна са злучэннямі і часцямі Узброеных Сіл пры адбіцці акта ўзброенай агрэсіі. Гэта і барацьба з дыверсійна-разведвальнымі сіламі, незаконнымі ўзброенымі фарміраваннямі, вядзенне партызанскай вайны на акупаванай сапернікам тэрыторыі, удзел ва ўзмацненні аховы ўчасткаў дзяржаўнай граніцы, удзел у ліквідацыі наступстваў прымянення сапернікам зброі масавага паражэння, вынікаў масіраваных удараў, правядзенне ратавальных і аварыйна-аднаўленчых работ, удзел у выкананні мерапрыемстваў па забеспячэнні падтрымання рэжыму ваеннага становішча і іншых мерапрыемстваў па абароне краіны.

***— Як камплектуюцца падраздзяленні тэрытарыяльнай абароны?***

— З ваеннаабавязаных запасу. У першую чаргу трэцяга разраду: як прыдатнымі, так і абмежавана прыдатнымі да службы ў ваенны час ваеннаслужачымі запасу. Агульная колькасць тэрытарыяльных войскаў у Беларусі складае 120 тысяч чалавек. Камплектаванне фарміраванняў праводзіцца з жыхароў адпаведных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак, здольных да ваеннай службы. Войскі тэрытарыяльнай абароны ўключаюць воінскія фарміраванні ў выглядзе асобных стралковых батальёнаў і асобных стралковых рот.

***— Якія мерапрыемствы прадугледжаны ў плане падрыхтоўкі асоб для выканання задач тэрытарыяльнай абароны?***

— У першую чаргу гэта заняткі па мабілізацыйнай гатоўнасці тэрытарыяльных войскаў, якія праводзіцца двойчы ў год ва ўсіх абласцях і Мінску. У кожным раённым ваенным камісарыяце заняткі праводзяцца двойчы ў год — вясной і восенню. Дарэчы, не так даўно ў сталіцы падобныя мерапрыемствы праводзіліся з упорам на падрыхтоўку органаў кіравання тэрытарыяльнай абаронай. Да іх прыцягваліся і ваеннаабавязаныя запасу, якія ўваходзяць у склад тэрытарыяльных войскаў. У ходзе правядзення заняткаў апрацоўваліся практычныя пытанні ўзаемадзеяння з пунктамі прыёму асабовага складу, дзе на прыкладзе нашага раёна дзесяць ваеннаабавязаных бралі ўдзел у дадзеных мерапрыемствах. Была праведзена практычная трэніроўка па прыёме ваеннаабавязаных, размеркаванні іх па камандах, экіпіроўцы і камплектаванні ваеннаабавязаных рэчавай маёмасцю і неабходным рыштункам. Хачу падкрэсліць, што ваеннаабавязаныя Першамайскага раёна, выкліканыя на падобныя мерапрыемствы, аднесліся да гэтага добрасумленна. Асабліва адзначу добрае выкананне пастаўленых задач з боку афіцэраў запасу. Асобныя з іх мелі за плячыма багаты вайсковы вопыт, якім яны шчодра дзяліліся з адміністрацыяй пункта прыёму асабовага складу па арганізацыі практычнай работы.

***— Якія задачы па падрыхтоўцы асабовага складу войскаў тэрытарыяльнай абароны належыць выконваць у недалёкай будучыні?***

— У рамках падрыхтоўкі тэрытарыяльнай абароны існуюць як планавыя, так і пазапланавыя мерапрыемствы. Напрыклад, у жніўні мінулага года тры сталічныя раёны, у тым ліку і Першамайскі, падвяргаліся пазапланавай праверцы, у ходзе якой з запасу былі прызваны 105 ваеннаабавязаных. У канцы вясны чакаем чарговую планавую праверку таксама з прызывам ваеннаабавязаных запасу. На працягу года пройдзе шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на падрыхтоўку органаў мясцовага кіравання, ваенных камісараў і начальнікаў груп тэрытарыяльнай абароны ўсіх раёнаў Мінска. Гэта, напрыклад, сумесныя штабныя трэніроўкі з адміністрацыямі сталічных раёнаў і многія іншыя мерапрыемствы. Вучоба абяцае быць вельмі насычанай.

***— Наколькі цеснае ўзаемадзеянне існуе паміж ваенным камісарыятам і адміністрацыяй Першамайскага раёна ў плане выканання задач тэрытарыяльнай абароны?***

— Узаемадзеянне наладжана вельмі цеснае. Інакш нельга. Не будзем забываць, што кіраўнік адміністрацыі нашага раёна з'яўляецца і кіраўніком раёна тэрытарыяльнай абароны. Яго намеснікі таксама выконваюць шэраг задач, звязаных з дзейнасцю войскаў тэрытарыяльнай абароны. Мы заўсёды знаходзім разуменне з боку кіраўніцтва адміністрацыі Першамайскага раёна, тут заўсёды ідуць нам насустрач.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

**Фота з архіва ваеннага камісарыята Першамайскага раёна.**

Тонкасці прафесіі

# Жанчыны на варце мірнага неба

## Ваеннаслужачыя Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны расказалі, што азначае для іх армія

**Ва Узброеных Сілах Беларусі служыць нямала жанчын. Нароўні з мужчынамі яны нясуць воінскі абавязак, з гонарам выконваючы пастаўленыя перад імі задачы. Жанчыны рэалізоўваюць сябе ў ваеннай медыцыне, журналістыцы, паказваюць высокія дасягненні ў дыпламатычнай службе і радуюць сваімі поспехамі на спартыўных пляцоўках. Нясуць прыгажуні ў форме і баявое дзяжурства па супрацьпаветранай абароне.**

Напярэдадні Дня войскаў супрацьпаветранай абароны (сёлета гэта 9 красавіка) карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з ваеннаслужачымі-жанчынамі, якія служаць у розных злучэннях Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны краіны. Ці жаночая гэта справа — Айчыну абараняць — і чаму вернасць службе не залежыць ад полу, даведаліся з першых вуснаў.




**Вераніка ЖЫГАЛКА атрымлівае падзяку з рук камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі супрацьпаветранай абароны Андрэя ЛУК'ЯНОВІЧА.**

### «Сумаваць не даводзіцца»

Прапаршчык Вераніка Жыгалка служыць у вайсковай часці ў Гродне. Яна сувязістка. Сёлета споўніцца дзесяць гадоў, як Вераніка вырашыла звязаць сваё жыццё з Узброенымі Сіламі. Прапаршчык прызнаецца, што служыць у арміі хацела даўно. Першапачаткова планавала паступаць у Ваенную акадэмію, але, як сама лічыць, крыху не хапіла ведаў. Аднак ад сваёй мэты адступаць не збіралася. Так атрымалася, што ў армію яе прывёў малады чалавек, які служыў у воінскім злучэнні.

— У той час, калі я прыйшла на службу, жанчын у арміі было няшмат, — заўважае Вераніка Жыгалка. — Цяпер такая тэндэнцыя, што на некаторыя спецыяльнасці з задавальненнем набіраюць дзяўчат. Мы больш пунктуальныя, цярплівыя і больш уважліва працуем з дакументамі. Зразумела, з тэхнікай жанчыны не вельмі сябруюць, але ёсць сярод нас і такія. Калі нешта не атрымліваецца, мужчыны нас заўсёды падтрымаюць і дапамогуць.

Як адзначае сувязістка, працаваць у мужчынскім калектыве за гэты час ужо прызвычаілася. Сярод калег ёсць той, на каго можна разлічваць не толькі ў службовай дзейнасці, але і дома. У палку Вераніка сустрэла мужа, які стаў надзейнай падтрымкай і апорай. «Сям'я на чамаданах, — менавіта так коратка і зразумела прапаршчык характарызуе шлюб дваіх ваеннаслужачых. — Планаваць нешта наперад складана. Трэба быць гатовым да ўсяго: да пераезду на новае месца службы, да выканання прафесійных абавязкаў у выхадныя і святочныя дні. Гэта толькі загартоўвае, мацуе нашу сям'ю».

Некаторыя думаюць, што ў арміі кожны дзень падобны на папярэдні. Вераніка з гэтым катэгарычна не пагаджаецца. «Кожны дзень у нас праходзяць заняткі, але яны заўсёды будуць адрозніваецца, — тлумачыць сувязістка. — Немалаважная ўвага ўдзяляецца фізічнай падрыхтоўцы вайскоўцаў. Таму сумаваць не даводзіцца».

Прыходзіцца чуць і такое, што служыць у арміі не жаночая справа. У Веранікі Жыгалкі і на гэтае меркаванне ёсць адказ. «У нас многія прафесіі не жаночыя, але паглядзіце, як выдатна там сябе рэалізоўваюць жанчыны, — звяртае ўвагу яна. — Нашы жанчыны ўсё могуць! І ў гады вайны яны нароўні з мужчынамі змагаліся з ворагам, здзяйснялі подзвігі. Жанчыны ўсюды патрэбныя».

### «Абараняць Радзіму — вялікая адказнасць»

Сяржант Таццяна Каваленка праходзіць службу ў вайсковай часці ў Бабруйску. У полк прыйшла год таму. Усяго ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь служыць амаль два дзесяцігоддзі. І ўвесь гэты час — у ваеннай сувязі. Яна выдатна валодае азбукай Морзэ, ведае ўсе нюансы радыёсувязі.



**Таццяна КАВАЛЕНКА.**

Таццяна з сям'і ваеннаслужачых. Таму пытанне, якую прафесію выбраць, перад ёй ніколі не ўзнікала. Таццяну натхняў прыклад бацькоў, якія служылі ў шматлікіх злучэннях Савецкага Саюза. Безумоўна, яна ведала, што лёс ваеннаслужачага няпросты: даводзіцца шмат ездзіць, адчуваць іншыя нязручнасці, аднак гэта не спыніла. Не перадумала, нават нягледзячы на тое, што ў свой час давялося памяняць чатыры школы. «Мама ўвесь час знаходзілася на службе, бацька вельмі шмат працаваў, бачылі яго або позна ўвечары, або раніцай, — згадвае яна. — Я гэтага не баялася. Ні разу не пашкадавала, што пайшла служыць. Не ўяўляю сябе без арміі».

Ваеннаслужачая лічыць, што служба ў арміі — і жаночая справа, але пры ўмове, што ў жанчыны моцны характар. «Не кожны можа быць гатовы да таго, што цябе ў любы час дня і ночы выклічуць на службу, — удакладняе яна. — Дысцыпліна распаўсюджваецца як на мужчын, так і на жанчын. Увогуле, абараняць Радзіму — вялікая адказнасць».

Муж Таццяны Каваленкі таксама ваеннаслужачы — афіцэр. Як прызнаецца Таццяна, калі размаўляеш з сужэнцам на адной мове, лягчэй будаваць быт. На бацькоў раўняецца і іх сын: ён таксама хоча насіць пагоны. Каб лягчэй было паступіць у Ваенную акадэмію або на ваенны факультэт дзяржаўнай ВНУ, малады чалавек вучыцца ў ваенна-патрыятычным класе. І гэта, як прызнаецца Таццяна, толькі яго рашэнне, якое бацькі-ваеннаслужачыя абавязкова падтрымаюць.

### «Я сябе знайшла ў арміі»

У старшага сяржанта Іны Катовіч за плячыма 23 гады службы. На працягу апошніх з іх яна працуе ў кадравай службе ў адной з воінскіх часцей Брэста. Прызнаецца, што ў армію трапіла выпадкова. Пажартавала са знаёмай, якая прыйшла да яе на працу ў ваеннай форме, што таксама хоча служыць. Тая сказала: «Прыходзь!» — і арганізавала сустрэчу з кіраўніцтвам ваеннай часці. Праз некалькі дзён Іна выйшла ўжо не на працу, а на службу, аб чым ніколі не пашкадавала.



**Іна КАТОВІЧ.**

«Ёсць пасады, дзе жанчына лепш справіцца, чым мужчына, у тым ліку калі размова ідзе пра ваенную службу, — пераканана Іна Катовіч. — Мы больш карпатлівыя, уважлівыя. Тая ж работа з дакументамі, напэўна, усё ж больш для жанчын».

— А ці служыў хтосьці з вашай сям'і? — цікаўлюся.

— Служыць. Калі прыйшла ў армію, то першага, каго ўбачыла, — будучага мужа.

Іна расказвае, што на працягу 20 гадоў разам з сужэнцам яны служылі ў адным падраздзяленні. «Нам было лёгка: дома — разам, на рабоце — разам», — заўважае яна. Увогуле, па словах Іны, армія — гэта стабільнасць. «Каб мне сёння давялося вызначацца з прафесіяй, я б зноў зрабіла такі ж выбар, як і больш за 20 гадоў таму, — прызнаецца ваеннаслужачая. — Я сябе знайшла ў арміі. Мяне ўсё задавальняе. Мне падабаецца пераадольваць пэўныя цяжкасці. Ні аднаго дня не пашкадавала, што прыйшла служыць».

**Вераніка КАНЮТА,**

**фота Лізаветы ГОЛАД.**

# Першы шашлык новай вясны

## Колькі ён зараз каштуе?

**Адна з галоўных прыкмет, што вясна прыйшла, — змешаны з першымі водарамі акрыялай прыроды апетытны дымок. І гэты дымок ужо адчуваецца вакол вадаёмаў і ў месцах масавага адпачынку гараджан на прыродзе. Гэта значыць, што самыя нецярплівыя адкрылі новы шашлычны сезон, а значыць, вясна і насамрэч прыйшла!**

### Свініна, курыца, бараніна

Ну, а галоўнае ў шашлыку — гэта, зразумела, мяса. Бо сутнасць усёй гэтай дзеі якраз у тым, што яна дае магчымасць адчуць сапраўдны, нават «першабытны», смак мяса, прычым у адпаведных дэкарацыях — на прыродзе (хатні электрагрыль сапраўдным шашлыкам не канкурэнт). І каб усё атрымалася, найважнейшае правіла (мабыць, другое па значнасці, бо правіла першае — гэта правільная кампанія) — свежасць асноўнага інгрэдыенту. Пра гэта і пагаворым.

— Ужо купляюць мяса на шашлык? — пытаюся ў прадаўшчыцы фермерскай свініны на Заходнім рынку сталіцы.

— Увесь год купляюць, нават зімой!

Класічны шашлык у нашых шыротах гатуюць са свініны: падыдуць шыя, выразка або паляндвічная частка, а таксама кумпяк.

— Толькі што насекла, свежачок. Цэны не канчатковыя, можна таргавацца, — запрашае прадавец. — На шашлык? Магу прапанаваць шыю, але дарагавата, па 17.99 за кіло. Так што лепш — сцягняк. Па 13 рублёў палічу. Як дадому прыйдзеце, адразу цыбульку, мінеральную ваду, спецыі і лімон, — з ходу дзеліцца рэцэптам марынаду суразмоўніца. — Будзеце задаволеныя.

Яна распавядае, што цяпер «модна» браць на шашлык (калі смажыць яго на рашотцы) свіныя рэбры — не тоўстыя, а танчэйшыя (у сярэднім 15 рублёў за кіло). Або эскалоп (па 14.55).

Курыны — другі па папулярнасці пасля свініны від шашлыку ў нашага насельніцтва. А ў гэтым годзе, хутчэй за ўсё, будзе першы, таму што гэта больш бюджэтна, ды і смажыць такі шашлык хутчэй. Тым больш што часткі курынай тушкі для смажання на мангале можна ўзяць любыя, а марынуецца курынае мяса, зноў жа, хутчэй за свініну. Часцей за ўсё пакупнікі, адпраўляючыся на прыроду, выбіраюць сцёгны, распавялі на Камароўцы.

— Цяпер на рашотцы ў асноўным шашлык смажаць, — кажа прадавец. — Гэта прасцей, бо рэзаць сцёгны не трэба. Калі на шампурах, можна падзяліць кожнае сцягно напалову.

Наогул, шампуры паступова сыходзяць у мінулае, кажа дзяўчына. З рашоткай менш марокі, а вынік той жа.

Хуткі варыянт курыцы на мангале — крыльцы, а таксама галёнкі. Некаторыя гатуюць на вуглях нават курыную грудку, але гэта складана: патрэбен пэўны навык ці кухарскі талент або і тое, і другое — інакш мяса можа атрымацца сухім.

Шашлык з ялавічыны таксама магчымы, хоць непапулярны ў нас: па-першае, не так проста яго смачна прыгатаваць, па-другое, дорага (калі вырашылі зрабіць менавіта такі шашлык — выбірайце паляндвічную частку або выразку і будзьце гатовыя выкласці за яе ад 27 да 36 рублёў за кіло). Ну, а класіка з бараніны — гэта ўжо зусім на аматара: не ўсім падабаецца і, зноў жа, палохае цана (і ў гэтым выпадку вам спатрэбіцца паляндвічная частка, але можна ўзяць і кумпяк).

— З бараніны шашлык у Мінскай вобласці амаль не гатуюць, гэта хутчэй такое выхадства — паспрабаваць новы смак. Бараніну ў нас часцей купляюць на плоў, — дзеліцца назіраннямі прадавец Марына. — А вось на Брэстчыне (я сама адтуль родам, з Пінска) часам такі шашлык можна пакаштаваць. Бараніна сама па сабе больш сакавітая, чым свініна. Дастаткова проста засыпаць у парэзаныя кавалкі мяса соль і спецыі, вытрымаць хвілін 30 і можна смажыць. Ні кефір, ні маянэз тут не патрэбны. Цыбуля кольцамі — абавязкова.

Дарэчы, такі шашлык смачнейшы будзе менавіта на шампурах, а не на рашотцы. І яшчэ адна хітрасць — перад смажаннем апырскаць мяса лімонным сокам — тады смак будзе далікатнейшы, а паху, якога ўсе баяцца, не будзе.

### «Пальчыкі абліжаш»

Такім чынам, свежасць мяса — аснова і абавязковая ўмова выніку «пальчыкі абліжаш». Смачны шашлык атрымаецца толькі з вельмі свежага, якаснага мяса, так што яго выбар на рынку ў дадзеным выпадку — пытанне ключавое. Улічваючы цяперашнія цэны на мяса, да гэтага выбару варта





падысці вельмі ўважліва. Хоць на буйных рынках заўсёды вялікі абарот і ў нашы дні жорсткі кантроль, усё ж ёсць рызыка, што вам паспрабуюць збыць «заляжалы» кавалачак.

Звычайна ў пацвярджэнне сваёй рэкламнай прапановы прадавец дае панюхаць абраны кавалак і тым самым пераканацца ў яго свежасці. У гэтай сувязі — лірычнае адступленне. Легенда сярод парфумераў нашага часу і стваральніца культавага водару Tresor Сафія Гройсман (яна родам з Беларусі і да 15 гадоў жыла на Гродзеншчыне, пад Навагрудкам), наведваючы Беларусь у 2007-м, распавядала журналістам, што яе неверагодна тонкі нюх дапамагаў маме заўсёды выбіраць самыя свежыя прадукты — мама брала дзяўчынку з сабой на рынак у Любчы... Але калі вы не валодаеце ўнікальным нюхам, наўрад ці ўдасца вывесці на чыстую ваду нядобрасумленнага прадаўца: у вопытных работнікаў рынку ў арсенале тысяча і адзін спосаб замаскіраваць «душок» нясвежага мяса. Праўда, ёсць хітрасць, кажуць прадаўцы.

— Папрасіце адрэзаць маленькі, тоненькі кавалачак ад вялікага кавалка, які вы выбралі. Патрымайце яго над агнём запальніцы. Калі дымок прыемны і апетытны, мяса свежае. Калі водар сумніўны — адмоўцеся ад пакупкі.

Колер мяса — яшчэ адзін недакладны крытэрый ацэнкі якасці прадукту. Сучасныя вітрыны аснашчаны спецыяльнай падсветкай, дзякуючы якой кавалкі ўнутры выглядаюць больш свежымі і прывабнымі, чым звонку. Папрасіце дастаць кавалак, які збіраецеся браць, і ацаніце яго знешні выгляд пры дзённым асвятленні. Можаце нават памацаць: на свежым мясе не застанецца ўвагнутасці ад пальцаў — яны тут жа разгладзяцца.

А можна абысціся без усялякіх тэстаў — проста знайсці «свайго» прадаўца, якому будзеш даваряць. Мяркуючы па ўсім, так робяць многія: на Камароўцы практычна ў кожнага прадаўца «са стажам» ёсць пастаянныя, або, як тут кажуць, любімыя, кліенты.

— На шашлык заўсёды выкарыстоўваецца самае дарагое мяса: тая частка тушы, якая не ўдзельнічала ў руху жывёлы, — расказвае Ала (яна гандлюе на Камароўцы ўжо больш за 15 гадоў).

На сёння, распавядае яна, з аднаго прылаўка сыходзіць каля 70—80 кг мяса. Але шашлычны сезон толькі пачынаецца, і з прыходам цяпла ў «мясных» радах чакаюць рост продажаў. А вось курынага мяса з аднаго прылаўка на Камароўцы прадаецца ў дзень у сярэднім у паўтара раза больш, распавялі прадаўцы. Але і канкурэнцыя тут вышэйшая — сваю прадукцыю прадстаўляюць як практычна ўсе птушкафабрыкі краіны, так і фермеры, і прыватнікі.

— На шашлыкі купляюць астуджаную «раздзелку», — расказвае прадавец Дар'я. — Сцёгны, галёнкі, часта крыльцы. У крыльцах мяса нямшат, затое яны гатуюцца ўмомант, смачна храбусцяць і шмат скуры — а яе якраз і любяць, хоць дыетолагі і кажуць пра шкоду.

За кілаграм галёнак з вас папросяць каля 6-7 рублёў, за сцёгны — у сярэднім 8.50, цэлую тушку палічаць па 5.50 або тыя ж 6 рублёў.

Тэрмін прыдатнасці астуджанай курыцы — да пяці-сямі дзён пры тэмпературы ад 0 да -4 градусаў і адноснай вільготнасці каля 80 %. Марынаваць на шашлык яе, зразумела, лепш адразу ж, прынёсшы з рынку.

Пры вызначэнні свежасці курыцы на рынку мы сутыкаемся з тымі ж праблемамі, што і з выбарам мяса: нам гэтак жа рэкамендуецца яе панюхаць, і гэтак жа існуюць спосабы замаскіраваць непатрэбныя пахі. І ўсё ж улічваем пры выбары: свежая курыца не пахне практычна нічым. Любы моцны пах — падстава сысці ад прылаўка да суседняга. Дома можна праткнуць адзін з набытых кавалачкаў нагрэтым нажом — пахнуць павінна смачна. А каля прылаўка можна яшчэ звярнуць увагу, ці выступае пры націску на курыцу вада. Калі так, яна відавочна размарожаная. Справа ў тым, што, калі тэрмін прыдатнасці астуджанай птушкі падыходзіць да лагічнага завяршэння, адна з хітрасцяў — замарозіць яе, і тады тэрмін рэалізацыі павялічваецца яшчэ на 2 месяцы.

— Але гэта датычыцца ў першую чаргу цэлай тушкі, і наогул цяпер так амаль не робяць: занадта вялікія абароты, прынамсі, на Камароўцы, і занадта высокая канкурэнцыя, — тлумачыць Дар'я. — Таму кожнаму прадаўцу важна, каб пакупнік вяртаўся менавіта да яго.

### Да пытання аб марынадзе

Пра тое, як замарынаваць мяса на ідэальны шашлык, «Звязда» гутарыла з рознымі кухарамі мінулай вясной. Паўтарацца не будзем. Нагадаем толькі, што прафесійныя кухары аднагалосна супраць класічных «савецкіх» марынадаў, якія дасталіся нам у спадчыну ад бацькоў і дзядоў: у воцаце і, вядома, у маянэзе. У воцаце мяса становіцца кіслым і губляе яго смак, ну а маянэз — гэта наогул спосаб зрабіць шкодней і без таго цяжкую ежу: пры высокай тэмпературы над вуглямі ён тут жа ператвараецца ў канцэраген. І да таго ж таксама перабівае сапраўдны мясны смак. Прафесіяналы кулінарнай сферы, адпраўляючыся на шашлыкі з сям'ёй, марынуюць мяса ў сумесі спецый (цыбуля 1:1, кінза, зіра, а соль і перац дадаюць ужо ў гатовае мяса). Або ў кашыцы цыбулі, піве, апельсінавым, а таксама лімонным соку і нават у віне (белым, таму што чырвонае змяшчае шмат танінаў, і смак мяса пацерпіць).

Зрэшты, разбэшчаны паўфабрыкатамі сучасны чалавек часам лянуецца марынаваць мяса сам і аддае перавагу «крамнаму шашлыку». Як не расчаравацца ў выніку? Перш за ўсё заўважым, што грошай такое рашэнне вам не сэканоміць: купіўшы свініну на рынку і замарынаваўшы яе самастойна (плюс выдаткі на спецыі і кефір, маянэз, сок або іншы прадукт для марынаду), вы выйдзеце на тую ж суму (з нязначным плюсам або мінусам), што і купіўшы гатовы мясны паўфабрыкат таго ж аб'ёму. Так, свініна, тазасцегнавая частка, у марынадзе ў адным з буйных сеткавых гіпермаркетаў каштуе 13.86 за кіло. А курыца ў марынадзе можа атрымацца нават крыху даражэйшай за марынаваныя дома сцёгны-крыльцы (у сярэднім 8 з капейкамі рублёў за кіло). Але калі, напрыклад, рашэнне з'ездзіць на шашлыкі прыйшло спантанна, то, купляючы мяса ў марынадзе, для пачатку глядзім на дату вырабу: мяса ў марынадзе «доўга не жыве» — вельмі хутка закісае. Звяртаем увагу на памеры кавалкаў — яны павінны быць аднолькавыя, інакш шашлык прапячэцца нераўнамерна. Чытаем склад прадукту: у ім павінны быць толькі мяса і інгрэдыенты марынаду. Ні ўзмацняльнікі смаку, ні араматызатары, ні рэгулятары кіслотнасці, ні загушчальнікі тут прысутнічаць не павінны. І, вядома, не варта спыняцца на мясе або курыцы ў складаных марынадах — з маянэзам, кетчупам і г. д., таму што такім чынам часам вытворца хавае пах не самага свежага мяса.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ,**
**фота аўтара**

---

Будзь у курсе!

## НА ВЫХАДНЫЯ І СВЯТОЧНЫЯ Ў КРАСАВІКУ-МАІ — ДАДАТКОВЫЯ ЦЯГНІКІ

**Беларуская чыгунка прызначыла больш за 130 дадатковых цягнікоў для забеспячэння перавозак пасажыраў у дні праваслаўнага Вялікадня, Радаўніцы і майскіх свят.**

Як інфармуе прэс-цэнтр магістралі, з улікам прагназаванага павелічэння пасажырапатоку ў перыяд з 14 да 16 красавіка ўнутры краіны дадаткова прызначаны цягнікі ў зносінах Мінск — Брэст, Мінск — Гомель, а 15 красавіка — у зносінах Мінск — Пінск. Таксама гэтымі днямі шэраг электрацягнікоў бізнес-класа ў зносінах Мінск — Брэст, Мінск — Гомель і Мінск — Калінкавічы будзе курсіраваць здвоенымі саставамі.

Акрамя таго, у перыяд з 21 да 26 красавіка на Радаўніцу прызначаны дадатковыя цягнікі, якія будуць курсіраваць па найбольш запатрабаваных у пасажыраў напрамках: Мінск — Брэст, Мінск — Гомель, Мінск — Віцебск, Мінск — Гродна, Мінск — Магілёў, Мінск — Пінск, Гродна — Орша — Крычаў, Віцебск — Мінск — Гродна і Мінск — Камунары.

Таксама ў выхадныя дні на Радаўніцу і майскія святы прызначаны наступныя дадатковыя цягнікі для праезду арганізаваных груп і індывідуальных пасажыраў у міжнародных зносінах:

Мінск — Санкт-Пецярбург: 21, 23 і 24 красавіка, 5 і 7 мая — цягнік № 250 Мінск — Санкт-Пецярбург адпраўленнем з Мінска ў 19.15; 22, 24 і 25 красавіка, 6 і 8 мая — цягнік № 249 Санкт-Пецярбург — Мінск адпраўленнем з Санкт-Пецярбурга ў 20.13;

Брэст — Мінск — Масква: 1, 7, 8, 9 мая цягнік № 236 Брэст — Масква адпраўленнем з Брэста ў 13.12; 2, 9, 10 мая цягнік № 235 Масква — Брэст адпраўленнем з Масквы ў 14.06; 8, 9 мая цягнік № 232 Мінск — Масква адпраўленнем з Мінска ў 23.14; 9, 10 мая цягнік № 231 Масква — Мінск адпраўленнем з Масквы ў 18.17; 8 мая цягнік № 237 Масква — Брэст адпраўленнем з Масквы ў 11.16;

Полацк — Віцебск — Масква: у перыяд з 27 красавіка да 9 мая цягнік № 239 Полацк — Масква адпраўленнем з Полацка ў 18.30; у перыяд з 28 красавіка да 10 мая цягнік № 240 Масква — Полацк адпраўленнем з Масквы ў 23.41.

Таксама, у залежнасці ад попыту на перавозкі, будзе павялічана колькасць месцаў для праезду пасажыраў у рэгулярных цягніках.

Работа па прызначэнні дадатковых цягнікоў працягваецца. Больш падрабязную інфармацыю аб прызначаных дадатковых цягніках і часе іх адпраўлення можна атрымаць на сайце www.rw.by, у мабільным дадатку «БЧ. Мой цягнік», а таксама па тэлефоне 105 Кантакт-цэнтра БЧ.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

29 сакавіка 2023 г. № 11 (697)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ГОД МІРУ І СТВАРАЛЬНАЙ ПРАЦЫ

# ВЯСНОВЫ ПАРАДАК, АЗДОБЛЕНЫ ПАМЯЦЦЮ



Памятны знак у памяць аб загінулых у Вялікай Айчыннай вайне земляках азарыцкія актывісты ўсталявалі ў 2015 годзе.





У гадавіну вызвалення вязняў Азарыцкага лагера смерці прайшоў мітынг-рэквіем каля мемарыяльнага комплексу.

**На Гомельшчыне сёлета асаблівая ўвага да гарадскога пасёлка Азарычы, што ў Калінкавіцкім раёне. Літаральна днямі ў населеным пункце пачнецца маштабная работа чарговага народнага патрыятычнага праекта — рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу ў памяць вязняў Азарыцкага лагера смерці. Як толькі дазволіла надвор'е, жыхары ўсіх раёнаў Гомельшчыны выйшлі на абласны суботнік, сродкі якога накіруюць на рэканструкцыю знакавага месца памяці. Між тым кіраўніцтвам рэгіёна пастаўлена задача максімальна прапрацаваць пытанні добраўпарадкавання не толькі зоны мемарыяла, але і тэрыторыі ўсяго гарадскога пасёлка.**



На Гомельшчыне больш за 500 тысяч чалавек прыняло ўдзел у абласным суботніку, сродкі якога накіруюць на рэканструкцыю комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне.

## Ад задумы да грунтоўных крокаў

Людзі вельмі рады такой увазе да іх населенага пункта і шчыра ўдзячныя: агульны настрой жыхароў гарпасёлка перадае **старшыня Азарыцкага сельвыканкама Галіна ПАНЦЯЛЕЕНКА.**

Некалі Азарычы былі раённым цэнтрам, цяпер — цэнтр сельсавета з 18 населеных пунктаў. Сёння ў гарпасёлку жыве амаль 1200 чалавек. Працуюць дзіцячы садок і сярэдняя школа. Садок наведваюць без малога 80 дзяцей, а школу — звыш 150 вучняў. Вучацца ў Азарычах не толькі дзеці з гарадскога пасёлка, але і з суседніх вёсак Лясец і Чырвоная Слабодка. У Азарычах ёсць і свая бібліятэка, аддзяленне сувязі, цэнтр вольнага часу, бальніца, дом-інтэрнат для састарэлых і людзей з інваліднасцю.

Старшыня Азарыцкага сельвыканкама Галіна Панцялеенка на пасадзе з 2014 года. Ужо ў першы год работы разам з вясковымі актывістамі ажыццявіла даўнюю ідэю мясцовых жыхароў.

— Паступіла просьба зрабіць памятны знак у гонар аб земляках, якія ваявалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і не вярнуліся з фронту. Гэта была ідэя вельмі актыўнага чалавека, нашага краязнаўцы, кіраўніка ветэранскай арганізацыі ў Азарычах Уладзіміра Лазаравіча Макатрова, — згадвае Галіна Панцялеенка. — Спадабаўся вобраз жураваў, якія паляцелі і не вярнуліся. Гэтую ідэю змог увасобіць у жыццё наш майстар па рабоце з металам, рамеснік Раман Міргарад. Зрабіў стэлу з трыма званочкамі, якія звоняць ад парываў ветру, жураваў над стэлай. На памятным знаку ўсталявалі гранітную пліту з імёнамі і прозвішчамі землякоў-франтавікоў.

Гэту ініцыятыву ў Азарычах ажыццявілі ў 2015 годзе. Сродкамі дапамаглі жыхары сельсавета, уключыліся дэпутаты і прадпрыемствы.

*(Заканчэнне на 9-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Сенатары — у працоўных калектывах



● **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАЧКОЎ** у рамках адзінага дня інфармавання наведаў ААТ «БМЗ — кіруючая кампанія холдынга «БМК» і сустрэўся з актывам працоўнага калектыву. Парламентарый выступіў па тэме «80 гадоў трагедыі ў Хатыні. Вынікі расследавання генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны». Акрамя таго, сенатар азнаёміў супрацоўнікаў прадпрыемства з вынікамі заканадаўчай дзейнасці Савета Рэспублікі ў 2022 годзе. Асобнай тэмай гутаркі стала геапалітычная сітуацыя ў свеце і яе ўплыў на Рэспубліку Беларусь. На сустрэчы з кіраўніцтвам завода былі абмеркаваны праблемныя пытанні і далейшыя перспектывы развіцця прадпрыемства. Парламентарый азнаёміўся з вытворчым працэсам, вынікамі фінансава-гаспадарчай і экспартнай дзейнасці завода, пагутарыў з працоўнымі на месцах. Асаблівая ўвага была ўдзелена ўмовам працы, своечасовасці выплаты заработнай платы, пытанням сацыяльнага развіцця холдынга. У гутарцы з журналістамі Сяргей Рачкоў падкрэсліў, што БМЗ — адно з найбуйнейшых прамысловых прадпрыемстваў у краіне. Па яго словах, дзякуючы старраннай працы рабочых завода, іх высокаму прафесійнаму ўзроўню, укараненню перадавых тэхналогій прадукцыя прадпрыемства добра вядомая не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

● З працоўным калектывам сустрэўся **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Міхаіл РУСЫ.** Сенатар наведаў ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат», які знаходзіцца ў г. п. Гарадзея, што ў Нясвіжскім раёне. Гарадзейскі цукровы камбінат з'яўляецца адным з сучасных шматпрофільных прадпрыемстваў, накіраваных на выпуск прадукцыі высокай якасці. «Стратэгічнае значэнне цукровай галіны для эканомікі Беларусі шматразова ў сваіх выступленнях падкрэсліваў кіраўнік дзяржавы, — звярнуў увагу Міхаіл Русы. — Яе развіццё цяпер ажыццяўляецца на аснове комплекснай сярэднетэрміновай стратэгіі, зацверджанай урадам краіны. Гэта вельмі перспектыўная сфера дзейнасці для нацыянальнай эканомікі. Агульны аб'ём вытворчасці цукровых буракоў нарасціле з 1,3 млн да 5 млн тон. Пастаянная наяўнасць айчыннага прадукту на паліцах па прымальнай для насельніцтва цане з'яўляецца асноўным індыкатарам стабільнасці харчовага рынку. Акрамя таго, улічваючы, што цукру ў краіне вырабляецца дастаткова, галіна валодае значным экспартным патэнцыялам». Азнаёміўшыся з работай прадпрыемства, сенатар адзначыў высокую эфектыўнасць вытворчасці, абмеркаваў перспектывы далейшай дзейнасці. Падчас дыялогу з працоўнымі ўзнімаліся розныя тэмы: ад цэнавай палітыкі ў нашай дзяржаве да няпростай знешнепалітычнай сітуацыі.

● **Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, генеральны дырэктар дзяржаўнай установы «Гомельаблпрам» Аляксей НЯВЕРАЎ** прыняў удзел у апаратнай нарадзе Гомельскага аблвыканкама.

На парадку дня — своечасовая выплата заработнай платы арганізацыямі вобласці, кантроль сістэмы рэгулявання цэн, разгортванне пасяўной кампаніі і ход весновых палявых работ, рэалізацыя металалому і спісанай тэхнікі сельгаспрадпрыемствамі, шэраг іншых пытанняў.

«Каб правесці сяўбу і іншыя сезонныя работы ў аптымальныя тэрміны, многім гаспадаркам неабходна падцягваць арганізацыйныя моманты і ўмацоўваць дысцыпліну. Часцяком кадравых, тэхнічных, матэрыяльных рэсурсаў хапае, а ў тэрміны ўкласціся не могуць, наракаючы на надвор'е. Праверкі ж паказваюць, як, напрыклад, у Рагачоўскім раёне, што сельгастэхніка ў 10.00 яшчэ стаіць на мехдвары, хаця даўно павінна быць у полі. Ад правільнай арганізацыі работ залежыць сапраўды шмат», — зазначыў сенатар.

**Вераніка КАНЮТА.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Чым зможам — дапаможам

**Асабістыя прыёмы грамадзян важныя не толькі для заяўнікаў, якія агучваюць як асабістыя праблемы, так і праблемы сваіх рэгіёнаў. Менавіта падчас іх вырашаюцца многія сацыяльныя, эканамічныя пытанні, што дае магчымасць ствараць больш камфортныя ўмовы для жыцця як асобнага чалавека, так і грамадскай суполкі ў цэлым.**



На думку **старшыні Мінскага абласнога Савета дэпутатаў, члена Савета Рэспублікі Наталлі ЯКУБІЦКАЙ,** такія мерапрыемствы даюць магчымасць азнаёміцца з рэальнымі патрэбамі грамадзян, атрымаць, так бы мовіць, інфармацыю з першых вуснаў. Акрамя таго, гэтыя сустрэчы маюць вялікае значэнне для наступнага аналізу сітуацыі і прыняцця правільных рашэнняў па развіцці населеных пунктаў, сельсаветаў і рэгіёнаў у цэлым.

Наталля Віктараўна штомесяц ладзіць адну прамую тэлефонную лінію, а таксама адзін прыём грамадзян у Мінаблвыканкаме. Выязджае яна і на асабісты прыём заяўнікаў у райцэнтрах Міншчыны. А каб забіць двух зайцоў, наведвае пры гэтым яшчэ 2-3 сельсаветы. Як адзначае Наталля Якубіцкая, на прыёмах у сельскай мясцовасці бывае больш людзей, чым непасрэдна ў гарадах. Людзі звяртаюцца з самымі разнастайнымі пытаннямі: уладкавання дарог, рамонту і прыватызацыі дамоў, паляпшэння жыллёвых умоў, увядзення дадатковага грамадскага транспарту, уладкавання аўтобусных прыпынкаў і шмат іншага. Многія пытанні ўдаецца вырашыць адразу, пракансультаваць заяўніка адносна таго, што яму рабіць у той ці іншай сітуацыі.

Сёлета такія сустрэчы прайшлі ў Немяніцкім і Перасадскім сельсаветах Барысаўскага раёна. Жыхарка Перасад паскардзілася на якасць пітной вады. Да вырашэння пытання падключыўся намеснік старшыні Мінаблвыканкама Аляксандр Кручанаў. Жанчына атрымала кансультацыю, ёй прапанавалі розныя варыянты вырашэння пытання. Заяўніца пагадзілася, што, сапраўды, бюджэт не можа адначасова справіцца ўсюды з «воднай» праблемай, паколькі яна існуе не толькі ў іх населеным пункце. Жанчына пагадзілася з прапановай уладкаваць водаправод з долевым удзелам дзяржавы і жыхароў.

У Дзяржынскім раёне жыхаркі аграгарадка Дворышча паскардзіліся на дрэнную работу каналізацыі. Наталля Якубіцкая патэлефанавала кіраўніку мясцовага «Водаканала». І літаральна праз некалькі гадзін у гэты ж дзень няспраўнасці былі ліквідаваны.

У канцы мінулага года да Наталлі Якубіцкай звярнулася жыхарка Слуцка накont пастаноўкі на ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па даручэнні Наталлі Віктараўны **старшыня раённага Савета дэпутатаў Наталля АЎСЯННІКАВА** выехала на месца і дэталёва разабралася ў сітуацыі, паведаміла, што ёсць магчымасць перавесці жыллё з арэнднага ў сацыяльнае. Акрамя таго, жанчыне была выдзелена аднаразовая матэрыяльная дапамога як маці, што выхоўвае сына-інваліда.

Падчас прыёмаў Наталля Якубіцкая звязваецца з раённымі кіраўнікамі, рэкамендуе разабрацца, унікнуць у тую ці іншую сітуацыю і без прамаруджвання прыняць меры да выпраўлення. А складаныя пытанні, якія патрабуюць выезду на месца, аналізуюцца, сістэматызуюцца. На іх грамадзяне атрымліваюць пісьмовыя адказы ў вызначаныя заканадаўствам тэрміны.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ЗНАЙСЦІ АДЭКВАТНЫЯ АДКАЗЫ ВЫКЛІКАМ ЧАСУ

## Гэта задача дэпутатаў, якія прадстаўляюць інтарэсы ўсяго насельніцтва



**Акцэнт на гэтым зрабіла старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЯНКЕВІЧ на сесіі аблсавета.**

«На гэтым этапе свет перажывае глабальныя перамены ва ўсіх сферах. Адносіны паміж краінамі, народамі, паміж грамадзянамі ўнутры краіны падвяргаюцца выклікам. І наша задача як дэпутатаў, якія прадстаўляюць інтарэсы ўсяго насельніцтва, — знайсці адэкватныя адказы гэтым выклікам», — падкрэсліла Кацярына Зянкевіч.

Кіраўнік дэпутацкага корпуса рэгіёна звярнула ўвагу: наша краіна заўсёды з'яўлялася донарам рэгіянальнай бяспекі. «Беларусь паслядоўна праводзіць міралюбівую знешнюю палітыку. Мы ведаем цану міру як ніхто іншы. Кожны трэці беларус загінуў у гады Другой сусветнай вайны. Для нас словы «мірнае жыццё» — не пусты гук», — акцэнтавала ўвагу старшыня абласнога Савета дэпутатаў.

Яна нагадала: Беларусь — краіна з сацыяльна арыентаванай эканомікай. «І гэта з'яўляецца самым надзейным гарантам справядлівасці, абароны ўсіх катэгорый грамадзян, у тым ліку найбольш уразлівых груп насельніцтва», — адзначыла Кацярына Зянкевіч.

Паводле яе слоў, Гомельская вобласць выконвае ўзятыя на сябе абавязацельствы, у рэгіёне шмат станоўчых момантаў. «Але разам з тым хачу засяродзіць увагу на тых акцэнтах, дзе мы, дэпутацкі корпус, не да канца выкарыстоўваем рэзервы. У прыватнасці, гэта датычыцца работы з грамадзянамі. Сёння неабходна прадоўжыць правядзенне сістэмнага аналізу зваротаў, асабліва тых, якія ўзнімаюць сацыяльную тэматыку. «Неабходна павысіць якасць інфармацыйна-тлумачальнай работы, забяспечыць асаблівы кантроль за выкананнем рашэнняў, прынятых па выніках разгляду зваротаў. Таксама мы павінны прыкласці максімум намаганняў да ўключэння ўсіх катэгорый грамадзян, прадпрыемстваў усіх формаў уласнасці ў вырашэнне пытанняў жыццезабеспячэння», — дапоўніла спіс задач старшыня аблсавета.

**БелТА.**

НАВІНЫ КАМІСІІ

# АСНОЎНЫ ПРЫЯРЫТЭТ — САЦЫЯЛЬНАЯ СКІРАВАНАСЦЬ

## Дадатковыя гарантыі працоўным, павышэнне даступнасці сацыяльных паслуг, якасная адукацыя і сістэмная работа з моладдзю

**Парламентарыі заўсёды трымаюць руку на пульсе найважнейшых працэсаў, якія адбываюцца ў грамадстве. Не застаюцца яны ў баку і ад праблем, якія хвалююць звычайных грамадзян, канкрэтнага чалавека. Нярэдка самі людзі падказваюць, на што варта звярнуць увагу падчас заканатворчасці.**



Над праектамі якіх законаў у дадзены момант працуюць парламентарыі, а таксама наколькі актыўна ў жыцці краіны ўдзельнічае моладзь і як наладжана зваротная сувязь з грамадзянамі, расказала **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына СТАРАВОЙТАВА.**

***— Ірына Анатолеўна, сфера інтарэсаў Пастаяннай камісіі заўжды была шырокай. На што ў цяперашні момант скіравана ўвага парламентарыяў?***

— Сацыяльная скіраванасць дзяржаўнай палітыкі нашай краіны азначае, што ў аснове вырашэння ўсіх пытанняў — чалавек, яго інтарэсы і патрэбы. Ключавымі напрамкамі работы Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца пытанні працы і занятасці, шлюбу і сям'і, аховы здароўя, адукацыі, навукі, фізічнай культуры і спорту, грамадскія аб'яднанні, рэлігійныя арганізацыі, маладзёжны рух і іншае. У камісіі на разглядзе знаходзіцца праект закона «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін», якім плануецца ўстанаўленне дадатковых гарантый працоўным. Акрамя таго, удасканальваюцца нормы, якія рэгулююць пытанні прадастаўлення працоўных і сацыяльных водпускаў. І гэта яшчэ не ўсе навацыі.

***— Напэўна, сам час дыктуе неабходнасць карэкціроўкі і некаторых іншых законапраектаў сацыяльнай скіраванасці?***

— Безумоўна. Асаблівая ўвага ўдзяляецца задачам удасканалення прававых механізмаў у пытаннях сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, павышэння даступнасці сацыяльных паслуг. Іх рэалізацыя плануецца ў рамках работы над праектам Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях сацыяльнага абслугоўвання». Цяпер ажыццяўляецца работа па ўнясенні змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях». Працуем і над праектам Закона Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях працоўных адносін». У далейшым плануецца разгляд праектаў законаў «Аб незалежнай ацэнцы і сертыфікацыі кваліфікацый», аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей», «Аб змяненні законаў па пытаннях рэгулявання шлюбных і сямейных адносін». На сістэмнай аснове праводзіцца маніторынг практыкі прымянення заканадаўства, які дае магчымасць выявіць найбольш уразлівыя месцы заканадаўства.

***— Увагі заканатворцаў рэгулярна патрабуюць і працэсы, якія датычацца ўдасканалення аднаой з найважнейшых сфер жыццядзейнасці грамадства — адукацыі...***

— Устойлівае сацыяльна-эканамічнае развіццё шмат у чым залежыць ад узроўню і якасці адукацыі. Сістэма адукацыі павінна быць рухомай, адказваць на глабальныя выклікі, адпавядаць узроўню грамадска-палітычных і эканамічных працэсаў, якія адбываюцца ў сучасным свеце, змяняцца і ўдасканальвацца ў інтарэсах чалавека, грамадства і дзяржавы. Стратэгічныя мэты развіцця адукацыі знайшлі сваё адлюстраванне ў Канцэптуальных падыходах да развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года. Для вырашэння абазначаных задач патрабавалася ўдасканаленне нарматыўна-прававога рэгулявання дзейнасці сістэмы адукацыі. Распрацаваны і прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі». У сувязі з прыняццем новай рэдакцыі Кодэкса з мэтай прывядзення 22 законаў і двух кодэксаў у адпаведнасць прайшоў абмеркаванне і быў прыняты праект закона «Аб змяненні законаў па пытаннях адукацыі».

***— На кантролі Пастаяннай камісіі — і пытанні маладзёжнай палітыкі...***

— Дзяржаўная маладзёжная палітыка з'яўляецца стратэгічным напрамкам сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Моладзь — найбольш актыўная частка грамадства. Патэнцыял маладога пакалення традыцыйна запатрабаваны ў эканоміка-тэхналагічнай, навуковай, сацыяльнай і інфармацыйнай сферах. У Беларусі моладзь ва ўзросце да 31 года складае больш чым 2,5 мільёна чалавек — чацвёртую частку насельніцтва. Прынцыпы дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі з'яўляюцца вызначальнымі для прыняцця заканадаўчых актаў па праблемах моладзі. Маладзёжны савет (парламент) удзельнічае ў пасяджэннях сесій Савета Рэспублікі, парламента, выязных прэзідыумах, прыёмах грамадзян па асабістых пытаннях, круглых сталах.

***— Хто ўваходзіць у Маладзёжны парламент?***

— Большая частка Маладзёжнага парламента — працоўная моладзь, якая праз сваю прафесійную, грамадскую дзейнасць з'яўляецца ўдзельнікам дзяржаўнага будаўніцтва. Трэба адзначыць, што для моладзі гэта добрая школа, дзе можна вучыцца ў прафесіяналаў, пераймаць вопыт адзін аднаго, праявіць сябе ў прасоўванні ініцыятывы, рабоце з людзьмі і нормамі заканадаўства. Мы не павінны дапусціць, каб моладзь была ўразлівай часткай грамадства. Наша задача — прадухіліць маніпуляванне нашай моладдзю з боку антыдзяржаўных плыняў для рашэння сваіх задач. Маладыя людзі павінны ўсведамляць адказнасць за свае дзеянні і супрацьстаяць любым дэструктыўным працэсам. Цяпер гаворка ідзе не толькі аб выхаванні падрастаючага пакалення, а аб захаванні міру, дабрабыту народа, стабільнай будучыні грамадзян нашай краіны. Таму важна, каб работа з моладдзю была сістэмнай, якая ахоплівае ўсё грамадства: сям'ю і ўстановы адукацыі, міністэрствы і ведамствы, арганізацыі і прадпрыемствы, выканкамы і грамадскія арганізацыі. А ў аснове гэтай работы — нашы каштоўнасныя арыенціры: гістарычная памяць, каштоўнасць сям'і, грамадзянскасць, духоўнасць, маральнасць, працавітасць.

***— Работа з людзьмі — адна з формаў дзейнасці парламентарыяў. Наколькі карысны для членаў камісіі дыялог з насельніцтвам?***

— Работа з насельніцтвам з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў у дзейнасці Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці. Толькі за мінулы год членамі Пастаяннай камісіі разгледжана каля 540 пісьмовых зваротаў. На сістэмнай аснове праводзяцца сустрэчы з працоўнымі калектывамі. У ходзе сустрэч закранаюцца пытанні, якія датычацца стану дарог, вольнага часу сельскіх жыхароў, замацавання маладых спецыялістаў у вёсцы, выдзялення жылля маладым спецыялістам, пытанняў патрыятычнага выхавання моладзі і іншыя. Мы ведаем, што хвалюе нашых людзей, чым яны жывуць, а таму імкнёмся разабрацца ў кожнай сітуацыі, пры гэтым многія моманты ўлічваем пры распрацоўцы заканадаўства.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ВЯСНОВЫ ПАРАДАК, АЗДОБЛЕНЫ ПАМЯЦЦЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Ужо ў 2021 годзе менавіта старшыня Азарыцкага сельвыканкама Галіна Панцялеенка ўзначаліла ініцыятыўную групу азарыцкіх актывістаў, якія распрацавалі і падрыхтавалі да ўдзелу ў конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў праект рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Лагер смерці Азарычы — боль і памяць». У ініцыятыўную групу ўвайшлі таксама настаўнік гісторыі Азарыцкай сярэдняй школы Зінаіда Хлебавец і намеснік дырэктара СШ Наталля Мельнікава, майстар па добраўпарадкаванні КУП «Камунальнік Калінкавіцкі» Святлана Байчук і рамеснік Раман Міргарад. Іх праект стаў адным з пераможцаў конкурсу грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў. Перамога ў спаборніцтвах праектаў прынесла грашовую дапамогу — пяць тысяч рублёў.

— Мы заявілі ў праекце ўсталяванне бардзюрнага каменя, банераў з фатаграфіямі і гістарычнымі фактамі, макетаў назіральных вышак, а таксама ўладкаванне да лагера дарожкі і вялікай пляцоўкі ў ім у форме крыжа. Таксама ў праекце прапісалі ўстаноўку каменнага знака, ліхтароў на сонечных батарэях уздоўж дарожкі да крыжа. Для поўнага ўвасаблення ў жыццё ўсіх задум выйграных у конкурсе сродкаў, вядома, было недастаткова. Дапамогу аказалі прадпрыемствы і арганізацыі раёна, мясцовыя жыхары. Зроблена многае, у тым ліку добраўпарадкавалі тэрыторыю вакол каплічкі і само збудаванне. Яго ўстанавілі каля мемарыяла ў 2010 годзе, і патрэбен быў ужо рамонт, — адзначыла Галіна Панцялеенка.

## Комплекснае добраўпарадкаванне

Сёлета гарадскі пасёлак Азарычы ўключаны ў план комплекснага добраўпарадкавання Гомельшчыны. Гэта практыка, якая дае новае жыццё населеным пунктам — ужо брэнд рэгіёна. Нядаўна нараду па маштабным навядзенні парадку ў Азарычах правёў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.**

— Праграма на найбліжэйшыя пяць гадоў прадугледжвае развіццё Акцябрскага і Азарычаў у 2023 годзе, Кармы і Капаткевічаў у 2024-м. У 2025-м мадэрнізацыя чакае Лельчыцы і Стрэшын, у 2026-м — Уваравічы, а ў 2027-м — Церухоўку, — зазначыў старшыня аблвыканкама.

У губернатарскай нарадзе па маштабным добраўпарадкаванні ў Азарычах прынялі ўдзел старшыня Калінкавіцкага райвыканкама Сяргей Гвоздзь, а таксама кіраўнікі ўпраўленняў, прадстаўнікі ўсіх адказных службаў. На іх кантролі — пытанні водазабеспячэння, асвятлення і ацяплення, дарожнай сеткі, капітальнага рамонту, мадэрнізацыі сацыяльных аб'ектаў у населеным пункце.

— Мы павінны прапанаваць паўнавартасныя інфраструктурныя і сацыяльныя аб'екты, падумаць, як развіваць пасёлак у далейшым, каб усім яго жыхарам, а гэта больш за 1000 чалавек, камфортна, у задавальненне жылося, — акрэсліў задачы комплекснага навядзення парадку ў Азарычах кіраўнік рэгіёна.

Як было адзначана, цяпер у Азарычах на фінішнай прамой абнаўленне сацыяльна значнага аб'екта, знакавага не толькі для Калінкавіцкага раёна, але і рэгіёна ў цэлым. Гаворка аб завяршэнні рэканструкцыі дома-інтэрната для састарэлых і людзей з інваліднасцю ў Азарычах. Работы на аб'екце пачаліся ў мінулым жніўні. За гэты час праведзена маштабная работа: адрамантаваны дах, выканана цеплавая рэнавацыя фасада, абсталявана сістэма вентыляцыі, заменены сеткі водазабеспячэння і каналізацыі, сістэмы ацяплення. Зроблена перапланіроўка асобных памяшканняў з абсталяваннем санвузлоў, праведзена рэканструкцыя харчаблока, устаноўлены ліфт.



Комплексная канцэпцыя рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу ў памяць вязняў Азарыцкага лагера смерці.





У цалкам абноўленым будынку размесціцца 129 чалавек.

Што датычыцца ўласна тэрыторыі гарадскога пасёлка Азарычы, то планам комплекснага навядзення парадку прадугледжаны добраўпарадкаванне вулічнай дарожнай сеткі, рамонт жыллёвага фонду і іншых сацыяльна значных аб'ектаў. Так, будзе цалкам адноўлены будынак мясцовага цэнтра вольнага часу. Патрабуе ўвагі і пасляковая бібліятэка 1953 года пабудовы. Вызначаны аб'ём работ па дзіцячым садку і сярэдняй школе.

На асаблівым кантролі застанецца навядзенне парадку на прыватных домаўладаннях, арандаваных аб'ектах.

— Адзінокім пажылым дапаможам, а астатнія няхай прымуць пасільны ўдзел у навядзенні парадку каля свайго дома, — адзначыў на нарадзе па добраўпарадкаванні Азарычаў Іван Крупко. — Рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне — знакавы аб'ект для ўсёй краіны, таму мы павінны навесці парадак у гарпасёлку, — падкрэсліў кіраўнік рэгіёна.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# Крыж на месцы расстрэльнай ямы

## У Ражкоўцы ўвекавечылі памяць ваенных падзей

**Вёску Ражкоўку, якая стаіць на ўскраіне Белавежскай пушчы, ведаюць многія. Сюды нярэдка заязджаюць экскурсіі. Сапраўды, унікальны выпадак, унікальны лёс. Карнікі прыехалі знішчыць населены пункт, людзей — забіць, хаты — спаліць. Але нешта пайшло не па плане. І людзі засталіся жыць...**

Цяпер у тутэйшай царкве захоўваецца як найвялікшая святыня абраз, які лічыцца выратавальным.

— Іх прыехалі забіваць 28 верасня 1942 года. Яму выкапалі адразу за вёскай, вялікую, як траншэя, — расказвае **старшыня Дзмітравіцкага сельскага Савета Вячаслаў РУСАКЕВІЧ.** — Усё адбывалася па такім жа сцэнарыі, як у іншых паселішчах. Мужчыны капалі яму, жанчыны галасілі, старыя маліліся. Але на ачэпленую вайскоўцамі тэрыторыю раптам прызямліўся самалёт, адтуль выйшаў нямецкі афіцэр і сказаў, што пакаранне адмяняецца.

Як потым растлумачылі перапалоханым людзям, лётчык-афіцэр у небе ўбачыў выяву Божай Маці, палічыў, што гэта знак, і прыняў рашэнне памілаваць людзей.



Гэта быў лётчык маёр Эміль Хёрбст. Праз некалькі месяцаў ён пабываў у Ражкоўцы, падарыў мясцовай грамадзе абраз Божай Маці, напісаны нямецкім салдатам, які, дарэчы, дасюль захоўваецца ў царкве. А потым, пасля ўрачыстай царкоўнай службы, як згадвалі старажылы, немцы падвалі прыхаджан да ямы, нагадалі ім, што жыццё іх да тае пары вісіць на валаску і залежыць ад іх паводзін. І ўдакладнілі: калі жыхары парушаць шматлікія забароны акупантаў, яма можа быць выкарыстана па яе прызначэнні.

Яму тую закапалі канчаткова толькі пасля вызвалення. Паступова пра яе сталі забываць.

Пазней у Ражкоўскай царкве паявіўся новы выратавальны абраз, якія зрабілі прафесіяналы па праваслаўных канонах. Але ж і ранейшы карыстаецца заслужанай павагай у прыхаджан.

А вось іншых знакаў у памяць пра тыя падзеі ў Ражкоўцы раней не было. Паводле слоў кіраўніка мясцовай улады, яма даўно зраўнавалася з зямлёй, парасла травой і кустоўем. А летась рашылі, што гэтае месца трэба неяк абазначыць, каб не страчвалася памяць, каб было дзе нагадваць нашчадкам, якія выпрабаванні выпалі на долю іх продкаў, як стаялі пад расстрэлам ні ў чым не вінаватыя людзі.

Ідэю сельвыканкама горача падтрымала **старшыня Камянецкага райсавета Ірына НІГЕРЫШ.** Пры падтрымцы раённага Савета мясцовая ўлада знайшла спонсараў, найперш правялі добраўпарадкаванне тэрыторыі, а потым вырабілі і ўстанавілі крыж. Крыж стаіць акурат у цэнтры былой вялікай ямы.



— Вясной пасадзім кветкі, давядзём да канца добраўпарадкаванне дарожак, прылеглай тэрыторыі, — расказвае Вячаслаў Русакевіч. — На Дзень Перамогі прыйдзем са школьнікамі, будзем гаварыць з імі пра тыя падзеі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.**
*Камянецкі раён.*



# Буравыя ўстаноўкі — на полі

## У Пінскім раёне праводзіцца дэтальная разведка радовішча базальтаў і туфаў

Базальт — гэта вулканічная парода, вельмі цвёрды камень. Яго выкарыстоўваюць у вытворчасці пліткі, арматуры, іншых матэрыялаў. З базальту выплаўляюць надзвычай тонкія і трывалыя валокны, якія становяцца асновай самых розных вырабаў. Наша краіна гэты каштоўны прыродны матэрыял купляе. Пакуль. Але ж вучоныя кажуць, што названы карысны выкапень ёсць і ў нашай зямлі, яго можна здабываць на Палессі.

— Сёлета за распрацоўку залежаў грунтоўна ўзяліся ў Пінскім раёне, — паведаміў **начальнік аддзела ідэалогіі і па справах моладзі Юрый БУШЫК.** — На землях сельгаспрадпрыемства «Навадворскае-Агра» разгарнуўся цэлы геалагічны гарадок. Тут устаноўлены вагончыкі для пражывання экспедыцыі, для захоўвання неабходнага абсталявання. З пачатку сакавіка спецыялісты бураць свідравіны, рухаюцца строга па квадратах, кожны ў 10 гектараў.

Дзяржавай выдзелены грошы: інвестыцыйны праект уключаны ў дзяржаўную праграму «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў на 2021—2025 гады». Праект падзелены на два этапы. Першы прадугледжвае правядзенне дэталёвай геалагічнай разведкі, па выніках якой будзе зроблена тэхніка-эканамічнае абгрунтаванне мэтазгоднасці асваення радовішча. Пры станоўчым заключэнні Пінскі райвыканкам можа прыступіць да рэалізацыі другога этапу — пошуку інвестара для асваення радовішча.

Конкурс на правядзенне разведкі, які праводзіўся па ініцыятыве Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, выйграла РУП «Навукова-вытворчы цэнтр па геалогіі». Яго спецыялісты і працуюць каля вёскі Новы Двор. Работа арганізавана вахтавым метадам, адна змена працуе два тыдні, затым заступае другая. Паводле папярэдніх разлікаў, геолагі будуць займацца бурэннем да чэрвеня. За гэты час правядуць адбор проб, зробяць лабараторныя даследаванні, падрыхтуюць матэрыялы для рэспубліканскай камісіі.

У Пінскім райвыканкаме спадзяюцца, што ўжо восенню будзе прынята станоўчае рашэнне, і раённы орган улады прыступіць да рэалізацыі праекта. Сыравіна вельмі патрэбная прадпрыемствам нашай краіны, такім як «Гомельбудматэрыялы», «Полацк-Шкловалакно», «Керамін» ды іншым. Акрамя таго, пабочным карысным выкапнем з'яўляецца пясок. У выпадку пачатку распрацоўкі там можна яго атрымаць каля 100 тысяч тон. Гэта таксама вельмі важны ў будаўнічай справе матэрыял.



Іван КІРЫКОВІЧ дэманструе ўзор пароды.

А перспектывы залежаў на Піншчыне спецыялісты ацэньваюць высока. Кажуць, што пінскі базальт не саступае па характарыстыках імпартнаму. Спачатку можа быць узведзены кар'ер па здабычы, а ў перспектыве — горназдабывальнае прадпрыемства. І тады ўжо можна будзе не толькі задаволіць свае патрэбы ў базальтах і туфах, але і пастаўляць пароду на экспарт.

**Старшыня Навадворскага сельвыканкама Іван КІРЫКОВІЧ** папярэджвае, што казаць пра здабычу карыснага выкапня пакуль рана:

— Вядзецца разведка на землях сельгасугоддзяў. Наперадзе — працэс ацэнкі мэтазгоднасці здабычы, пошук інвестара. Калі ж справа дойдзе да распрацоўкі, то апошняя павінна паспрыяць развіццю нашых тэрыторый.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота з тэлеграм-канала Пінскага райвыканкама.**

# ТАНЦУЮЦЬ УСЕ,

## або Чым здзіўляюць сельскія клубы

**Захаванне і развіццё культуры на вёсцы было і застаецца прыярытэтам дзяржавы. Сельскія ўстановы культуры прапануюць вяскоўцам не толькі творчыя мерапрыемствы, канцэрты, разнастайныя вечарыны і святы. Клубы, дамы культуры з'яўляюцца тым месцам, цэнтрам, дзе сустракаюцца вяскоўцы, каб абмеркаваць лакальныя навіны. Для іх гэта акно ў свет. Што робіцца сёння ў Капыльскім раёне, каб гэтыя ачагі культуры не згаслі, даведалася карэспандэнт «Мясцовага самакіравання».**



Помнік маладому Цішку Гартнаму.

— Культурнае абслугоўванне насельніцтва сельскай мясцовасці раёна ажыццяўляюць 35 устаноў, у тым ліку 18 клубаў, сярод іх раённы цэнтр творчасці ў аграгарадку Семежава, раённы цэнтр традыцыйнай культуры ў аграгарадку Мажа, 17 публічных бібліятэк, у тым ліку 8 інтэграваны са школьнымі, — расказала **старшыня Капыльскага раённага Савета дэпутатаў Ірына КІСЛЯК.**

Дапамагаюць аўтаклубы і бібліёбусы. Гэта своеасаблівыя перасоўныя культурныя цэнтры, якія здольныя дайсці да самай аддаленай вёскі. Аўтаклуб перавозіць не толькі артыстаў, але і неабходную для канцэрта, выступлення апаратуру. Ніякім эквівалентам не вымераць тую радасць, добры настрой, якія дораць жыхарам глыбінкі супрацоўнікі цэнтральнай раённай бібліятэкі імя Анатоля Астрэйкі.



Фота БелТА.

Унікальнае ткацтва — адна з візітовак Капыльшчыны.

— У аграгарадку Цімкавічы функцыянуе ўстанова дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі — дзіцячая школа мастацтваў, філіялы якой працуюць у Старыцкай сярэдняй школе і ў аграгарадку Быстрыца на базе бібліятэкі. Капыльская дзіцячая школа мастацтваў аказвае паслугі непаўналетнім, якія вучацца ў Семежаўскай і Слабада-Кучынскай сярэдніх школах, — адзначыла Ірына Мікалаеўна.

У аграгарадку Семежава працуе таксама экспазіцыя Капыльскага раённага краязнаўчага музея, прысвечаная жыццю і дзейнасці Героя Беларусі Міхаіла Сцяпанавіча Высоцкага, экспазіцыя этнаграфіі і быту ў вёсцы Вялешына.

У аграгарадках Семежава і Пясочнае створаны цэнтры культуры і адпачынку, раённы цэнтр традыцыйнай культуры ў вёсцы Мажа. У 2009 годзе пачаў працу Слабада-Кучынскі сельскі клуб.

— Адразу відаць, што культурнай работай на вёсцы ахоплена значная частка жыхароў. Але ж ёсць у раёне і аддаленыя, маланаселеныя вёскі, дзе не было або з аб'ектыўных прычын закрытыя клубы. Як людзі задавальняюць свае культурныя запатрабаванні? — пацікавілася ў сваёй суразмоўніцы.

— Разнастаіць жыццё вяскоўцаў, далучыць іх да свету прыгожага. Яны заўсёды парадаюць, што пачытаць, раскажуць, якія кніжныя навінкі з'явіліся. У наступны прыезд даставяць заказаную вяскоўцамі літаратуру, перыёдыку. Мабільная перасоўная сістэма абслугоўвання курсіруе адпаведна вызначанаму графіку па папярэдне распрацаваным маршруце, — растлумачыла Ірына Кісляк.



На Алеі пісьменнікаў.

У сваёй рабоце супрацоўнікі ўстаноў культуры выкарыстоўваюць разнастайныя сучасныя формы работы з насельніцтвам. Усе бібліятэкі камп'ютарызаваныя, ёсць доступ у інтэрнэт, таму аказваюць паслугі з выкарыстаннем сучасных інфармацыйных тэхналогій. У бібліятэках раёна працуе 36 аматарскіх аб'яднанняў, з іх 30 — для дзяцей. У клубных установах разнастайнымі формамі аматарскай творчасці ахоплена больш як 800 дарослых і дзяцей, якія з'яўляюцца ўдзельнікамі сотні клубных фарміраванняў. У прыватнасці, за мінулы год праведзена 3905 мерапрыемстваў, якія наведала ў тым ліку амаль 17 тысяч сельскіх жыхароў.

Кірункі клубных фарміраванняў розныя: пазнавальнае, экалагічнае, патрыятычнае, творчае, спартыўнае. А ў раённым цэнтры адкрытая для дзяцей «Школа ткачоў». Удзельнікі яе з'яўляюцца пераможцамі абласных і рэспубліканскіх фестываляў, конкурсаў.

Візітоўкай, брэндам раёна сталі абласны фестываль гульні і гумару «Капыльскія пацехі», рэгіянальнае свята-конкурс па ткацтве «Млечны шлях ад рук бабулі», якое праходзіць раз на тры гады. Статус гісторыка-культурнай спадчыны мае тэхніка закладнога ткацтва чырвона-белых ручнікоў у аграгарадку Семежава. Званне «Народны майстар» прысвоена васьмі ткачыхам Капыльскага раёна, у іх ліку дырэктар раённага цэнтра ткацтва Таццяна Волкава. Таццяна Мікалаеўна прадстаўляла семежаўскія ручнікі на 20-м міжнародным фестывалі культуры і мастацтва «Бююкчэкмеджэ» ў турэцкім Стамбуле, на іншых форумах.

У раёне з'яўляюцца і новыя святы. Напрыклад, у 2022 годзе ў аграгарадку Цімкавічы ўпершыню прайшло літаратурна-музычнае свята «Цімкавіцкія вытокі» пры падтрымцы Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.

— Неад'емнай часткай культурнай палітыкі з'яўляецца ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, стан будынкаў і прылеглых тэрыторый. Для правядзення бягучых работ у 2022 годзе было выдзелена амаль шэсцьдзесят тысяч рублёў. Выканана работ на суму 71 тысяча рублёў.

Шмат у сферы культуры было зроблена падчас падрыхтоўкі да Дня беларускага пісьменства і абласных «Дажынак», якія адбыліся ў верасні 2021 года. У прыватнасці, у Капылі была пабудавана і адкрыта дзіцячая бібліятэка з кіназалай. Абноўлены фасады і інтэр'еры будынкаў дзіцячай школы мастацтваў, раённага цэнтра культуры, раённага краязнаўчага музея, добраўпарадкаваны прылеглыя тэрыторыі. Устаноўлены помнік Цішку Гартнаму, уладкавана Алея пісьменнікаў, дзе з'явілася 17 інтэрактыўных пляцовак з інфармацыяй аб літаратарах, якія нарадзіліся ў Капыльскім раёне. Для кожнага аб'екта зрабілі QR-код, па якім можна атрымаць доступ да біяграфіі празаікаў і паэтаў, азнаёміцца з іх творчасцю.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15
ад 17 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**www.zviazda.by**

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 10.558.** **Нумар падпісаны ў 19.30 28 сакавіка 2023 года.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by | | |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 | | |
| **Публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области** | | | |
| **Предмет публичных торгов (аукциона)** | | | |
